## ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

**Ідзе падпіска на IV квартал 2008 года**

**Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)**

| Індэкс | на 1 месяц | на 3 месяцы |
|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 9200 | 27600 |
| 63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 8700 | 26100 |
| 63858 (ведамасны) | 14700 | 44100 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 13400 | 40200 |



*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9 ВЕРАСНЯ 2008 г.
АЎТОРАК
№ 169
(26282)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.


Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «БЕЛАРУСЬ БЫЛА, ЁСЦЬ І БУДЗЕ САЮЗНІКАМ БРАЦКАЙ РАСІІ»



Фота БЕЛТА.



Учора беларускі лідар у Нацыянальнай бібліятэцы сустрэўся з прадстаўнікамі СМІ расійскіх рэгіёнаў, якія падчас традыцыйнага прэс-туру (дарэчы, шостага па ліку) наведалі нашу краіну.

У Беларусь прыехалі 84 журналісты з 44 рэгіёнаў Расіі, яны прадстаўлялі 72 СМІ. Праграма была насычанай — госці наведалі вытворчае аб'яднанне «Беларуськалій», прамысловае прадпрыемства ў Заслаўі, агракамбінат «Сноў», пазнаёміліся з аб'ектамі сацыяльнай інфраструктуры Слуцка, а таксама ўзялі непасрэдны ўдзел у мерапрыемствах Дня беларускага пісьменства ў Барысаве. Так што да выніковай прэс-канферэнцыі з Прэзідэнтам Беларусі прыйшлі інфармаванымі. На працягу трох гадзін беларускі лідар адказаў на 25 пытанняў расійскіх журналістаў.

Адпаведныя прэс-туры аказаліся надзвычай эфектыўнай формай узаемадзеяння. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, такое рашэнне колькі гадоў таму было прынятае з мэтай больш інфармаваць жыхароў суседняй дзяржавы аб рэальным жыцці беларусаў. Аб'ектыўная інфармацыя пра Беларусь асабліва запатрабаваная ў расійскай глыбінцы. «Наш Саюз з Расіяй асабліва цэментуюць менавіта міжрэгіянальныя сувязі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Летась аб'ём беларуска-расійскага тавараабароту склаў 26 мільярдаў долараў, а сёлета дасягне 30 мільярдаў. Разам з тым, нягледзячы на яўны прагрэс у развіцці двухбаковых эканамічных сувязяў, будаўніцтва Саюзнай дзяржавы пакуль знаходзіцца на «замарожаным» этапе. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт. «Мы, безумоўна, многа зрабілі, аднак усяго гэтага можна было дасягнуць і без стварэння Саюзнай дзяржавы». Таму ў гэтым плане павінна адбывацца больш актыўнае развіццё, у абедзвюх краін агульныя мэты».

Свае абавязкі наша дзяржава няўхільна выконвае. Як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, на жаль, занадта многа міфаў існуе аб нашай краіне. У асобных расійскіх сродкаў масавай інфармацыі, мабыць, проста паталагічная нелюбоў да Беларусі. Вось так і з'яўляюцца розныя небыліцы. Напрыклад, апошнім часам шмат інсінуацый вакол пазіцыі Беларусі да сітуацыі ў Паўднёвай Асеціі і Абхазіі. «Беларусь была, ёсць і будзе саюзнікам брацкай Расіі», — перакананы беларускі лідар. Пытанне прызнання незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі — пытанне больш складанае, чым проста падтрымка ці непадтрымка пазіцыі Расіі. «Прыйдзе час і мы разгледзім гэтае пытанне ў Беларусі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Зноў абраныя дэпутаты абавязкова звернуцца да яго разгляду».

Калісьці менавіта беларускі лідар выказаўся супраць эканамічнай і палітычнай блакады Абхазіі (на чым настойвала кіраўніцтва Грузіі). Прэзідэнт нагадаў, што неўзабаве пасля ўзброенага канфлікту Беларусь адправіла ў Паўднёвую Асецію гуманітарны груз і накіравала групу спецыялістаў, якія на месцы ацэняць сітуацыю і распрацуюць канкрэтную праграму дапамогі.

«Мы дакладна выразілі салідарнасць з пазіцыяй Расіі, якая хутка і эфектыўна змусіла агрэсара да міру, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы выступілі з ініцыятывай выпрацаваць эфектыўную адзіную пазіцыю дзяржаў — удзельніц Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы па сітуацыі на Каўказе. І ў той інфармацыйнай вайне, якую Захад разгарнуў супраць Расіі, Беларусь актыўна праводзіць палітыку ўсебаковай і паслядоўнай падтрымкі свайго стратэгічнага саюзніка». Тут, дарэчы, варта хоць бы ўзгадаць пазіцыю нашай дзяржавы па пытанні размяшчэння ў Еўропе элементаў супрацьракетнай абароны ЗША.

Цяперашняя сітуацыя ў свеце характарызуецца многімі глабальнымі пагрозамі. І гэтаму неабходна супрацьпаставіць аб'яднаныя дзеянні. Дасюль існуюць пэўныя нюансы, якія не могуць задавальняць у АДКБ. Як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, хацелася, каб АДКБ стала арганізацыяй з дысцыплінай кшталту НАТА. «У іх ёсць дакладны дагавор: якая-небудзь краіна з НАТА падверглася агрэсіі, то ваююць усе. А ў нас такі пункт нават не ўсе ўдзельнікі ратыфікавалі. Але да гэтага неабходна імкнуцца», — падкрэсліў беларускі лідар. Калі Беларусь і Расія, з'яўляючыся саюзнікамі, падрыхтаваныя да такой схемы, то яе трэба ўвасабляць. «Калі ж да нас пажадаюць далучыцца іншыя краіны, то варта ўсё прапісаць і жорстка выконваць», — лічыць Прэзідэнт. Ёсць намер юрыдычна аформіць сумесную сістэму супрацьпаветранай абароны, праўда, гаворка не вядзецца пра размяшчэнне на тэрыторыі Беларусі ядзернай зброі.

Паколькі наша краіна — сапраўдны «мост» паміж Усходам і Захадам, то варта ўсяляк развіваць адносіны з усімі дзяржавамі. Аднак рабіць гэта Беларусь будзе ніколькі не ва ўрон Расіі. «Я сяброўствам з Расіяй не гандлюю, — заявіў беларускі лідар. — Мы ў самым цесным саюзе з Расійскай Федэрацыяй — у эканамічных, палітычных, ваенных адносінах». У гэтым ёсць зацікаўленасць з боку прэзідэнта Расіі Дзмітрыя Мядзведзева. Для вырашэння надзённых пытанняў двухбаковага ўзаемадзеяння сустрэчы лідараў Беларусі і Расіі будуць праводзіцца рэгулярна. Дарэчы, расійскі Прэзідэнт мяркуе да канца гэтага года наведаць з афіцыйным візітам беларускую сталіцу.

Узважаная пазіцыя характарызуе беларускія ўлады і ў вырашэнні ўнутраных праблем. У прыватнасці, надзвычай далікатны падыход павінен быць падчас працэсу прыватызацыі. «Абвальнай прыватызацыі не будзе», — паведаміў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі вызначаны канкрэтны пералік дзяржаўных прадпрыемстваў, якія падлягаюць акцыянаванню. Аднак, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, гэта ніколькі не абазначае, што іх будуць «распрадаваць». У шэрагу буйных прадпрыемстваў (кшталту «МАЗа», «БелАЗа», «МТЗ», «Беларуськалія») дастаткова ўнутраных рэзерваў для забеспячэння ўласных перспектыўных праграм развіцця. Акцыянаваць плануецца толькі тыя прадпрыемствы, якія з дапамогай знешніх інвестыцый атрымаюць рэальны шанц на будучыню. «Нават калі прыйдзе цікавы інвестар, які хоча набыць 10 працэнтаў акцый, то мы разгледзім такую прапанову. Аднак кантроль над прадпрыемствам не губляем», — заўважыў Прэзідэнт.

Беларуская эканоміка развіваецца інтэнсіўна: сярэднегадавы прырост валавога ўнутранага прадукту летась перавысіў 8 працэнтаў, а, сёлета, як мяркуецца, перасягне 10 працэнтаў. Сёлета сабраны рэкордны ўраджай збожжа — нават большы, чым у Краснадарскім краі. Вельмі пазітыўна, што гэты небывалы паказчык забяспечаны ў асноўным за кошт айчыннай сельскагаспадарчай тэхнікі. За апошнія дзесяць гадоў у нашай дзяржаве створана ўласная лінейка высокатэхналагічных камбайнаў. Дарэчы, раней на распрацоўку толькі адной мадэлі патрабавалася сама меней 12 гадоў. Цяпер вялікі попыт на беларускую тэхніку ва ўсім свеце — на прадукцыю МТЗ, МАЗа вялікія чэргі. Зразумела, прыярытэт — унутраным спажыўцам.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ПАСЛЯ РЭКОРДНАЙ ЦЕПЛЫНІ — МОЦНАЕ ПАХАЛАДАННЕ І ЗАМАРАЗКІ

**Сёння, пачынаючы з Брэсцкай вобласці, на тэрыторыю Беларусі завітае даволі актыўны цыклон, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.**

На працягу дня істотна пахаладае, стане воблачна і дажджліва, месцамі чакаюцца моцныя навальнічныя дажджы. Тэмпература паветра ўдзень 16—22 градусы, толькі па Гомельскай вобласці — да 24. Тэмпература ўначы ў сераду 7—13 градусаў, удзень — 12—18. Кароткачасовыя дажджы 10 верасня чакаюцца па паўночна-ўсходняй палове краіны. Тэмпература паветра ўначы ў чацвер будзе ўжо толькі 5—11 градусаў цяпла, а ўдзень — 10—16. Месцамі па ўсходзе невялікія дажджы.

У пятніцу будзе не проста холадна, але і падмарозіць. Толькі па ўсходзе чакаецца невялікі дождж. Тэмпература паветра ўначы 1—8 цяпла, месцамі замаразкі да 0 мінус 3 градусаў, удзень 8—15 цяпла. У выхадныя ўначы стане яшчэ халадней: тэмпература плюс 1—8, паўсюдна замаразкі 0 — мінус 3 градусы, на тарфяніках Палесся на глебе замаразкі да 4—6 марозу. Тэмпература ўдзень 7—12 цяпла. Сіноптыкі лічаць, што надвор'е ў гэтыя выхадныя будзе па тэмпературным рэжыме на 2—4 градусы ніжэй за кліматычную норму.

А вось у мінулыя выхадныя, 7 верасня, быў пастаўлены рэкорд самага цёплага дня на гэту дату на ўсіх метэастанцыях Беларусі, акрамя Вілейкі, Гродна і Горак. Найбольш цёпла ў гэты дзень было ў Лельчыцах Гомельскай вобласці — 33,5 градуса.

Менавіта ў нядзелю на 11 станцыях паўднёвага ўсходу краіны былі зафіксаваны новыя абсалютныя максімумы тэмпературы паветра ў верасні за ўвесь час інструментальных назіранняў.

Сёлета ў верасні ў краіне быў зафіксаваны самы цёплы тыдзень гэтага месяца. У Мінску такі цёплы тыдзень верасня бывае раз у 9 гадоў, у Брэсце — упершыню пасля 1945 года, у Віцебску — раз у 12—13 гадоў, у Гомелі і Гродне — раз у 10—11 гадоў, у Магілёве — раз у 7—8 гадоў.

Як бачым, спачатку надвор'е прапанавала нам выпрабаванне спякотай, а ўжо праз тыдзень — дажджом, пахаладаннем і бадай кастрычніцкімі замаразкамі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### МІНГАРВЫКАНКАМ АКАЖА МАТЭРЫЯЛЬНУЮ ДАПАМОГУ ПЕНСІЯНЕРАМ І ВЕТЭРАНАМ НА ЗАКУПКУ СЕЛЬГАСПРАДУКЦЫІ

**Аб гэтым паведаміў старшыня Мінгарвыканкама Міхаіл Паўлаў на аператыўнай нарадзе ў мэрыі.**

Паводле яго слоў, цяпер памер матэрыяльнай дапамогі ўдакладняецца. «Трэба вызначыць такую суму, памер якой дасць магчымасць закупіць агародніну на зіму», — сказаў мэр сталіцы. Адпаведнае рашэнне будзе прынята ў самы бліжэйшы час, каб у верасні пенсіянеры і ветэраны маглі ўжо атрымаць грошы і патраціць іх па прызначэнні, дадаў Міхаіл Паўлаў.

У верасні—лістападзе ў Мінску будзе арганізаваны выязны гандаль сельскагаспадарчай прадукцыяй. Шырокі продаж бульбы і плодаагароднінай прадукцыі разгорнецца ва ўсіх раёнах сталіцы — на 10—20 пляцоўках у кожным. Пры гэтым выязны гандаль будзе максімальна набліжаны да жылых мікрараёнаў, шматкватэрных жылых дамоў. Арганізацыям аптовага і рознічнага гандлю, сельгасарганізацыям, фермерскім гаспадаркам у гэты перыяд дазволена штодзень прадаваць вітамінны тавар з аўтамашын і латкоў у месцах, устаноўленых адміністрацыямі раёнаў. Галоўная ўмова — наяўнасць дакументаў, якія засведчваюць якасць і бяспеку прадукцыі. Выязны гандаль пачнецца 20 верасня з агульнагарадскога кірмашу каля Палаца спорту. Новаўвядзенне гэтага сезона — кірмаш рыбы: 9 рыбаводчых гаспадарак рэспублікі прапануюць гараджанам усе віды сажалкавай рыбы.

**БЕЛТА.**

### ДАІ ШУКАЕ СВЕДАК ДТЗ

**ДАІ Мінскай вобласці аб'явіла пошук сведак ДТЗ у Лагойскім раёне, паведамілі ў аператыўнай дзяжурнай часці Дзяржаўтаінспекцыі.**

Учора каля 4 гадзін раніцы ў Лагойскім раёне на 58-м км аўтадарогі Барысаў — Лагойск — Ашмяны невядомы вадзіцель, кіруючы неўстаноўленай машынай, рухаўся ў бок гарадскога пасёлка Плешчаніцы і ўчыніў наезд на пешахода (жыхар Барысава, 1990 года нараджэння). У выніку ДТЗ пешаход памёр на месцы. На яго адзенні былі ўстаўкі са святлоадбівальнай тканіны. У наездзе падазраецца грузавая аўтамашына.

Дзяржаўтаінспекцыя Мінскай вобласці просіць усіх, каму штонебудзь вядома па дадзеным факце здарэння, паведаміць па тэлефонах: 8 017 204 71 01, 8 017 204 78 11 або 102.

### ПЕРАЛІКІ НАРКАТЫЧНЫХ СРОДКАЎ БУДУЦЬ ГАРМАНІЗАВАНЫЯ

Нарада экспертаў міністэрстваў аховы здароўя і ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрства аховы здароўя і сацыяльнага развіцця Расійскай Федэрацыі і Федэральнай службы кантролю за абаротам наркотыкаў адбылася ўчора ў Мінску. Ініцыятарам сустрэчы стаў беларускі бок.

— Спецыялісты нашага міністэрства правялі аналіз разыходжанняў у пераліках наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў у Беларусі і ў Расійскай Федэрацыі і накіравалі расійскаму боку свае прапановы па магчымых накірунках іх гарманізацыі, — патлумачыла начальнік упраўлення інспекцыі і арганізацыі лекавага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя Беларусі Людміла Рэуцкая. — Пры гэтым гарманізацыя павінна ажыццяўляцца такім чынам, каб пры вызначэнні статусу кожнага сродку ці рэчыва не зніжаліся меры кантролю за абаротам наркатычных і псіхатропных сродкаў унутры кожнай з дзвюх краін.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### БЫК ЗАБІЎ ДАЯРКУ

У Міёрскім раёне адбылася трагедыя — у выніку траўмаў, прычыненых быком, памерла 47-гадовая жанчына. Яна ўвечары з двара свайго дома выводзіла на пашу скаціну. Бык нанёс ёй шматлікія раненні. Вызвалі «хуткую дапамогу». Потым урачы доўга змагаліся за жыццё жанчыны, але...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# «Слова Беларускае вечнае!»

Рэпартаж з колаў

Звон над Барысавам сімвалізаваў адкрыццё XV Дня беларускага пісьменства. На цэнтральнай плошчы горада, дзе адбылося тэатралізаванае дзеянне цырымоніі адкрыцця свята, гасцей віталі прадстаўнікі арганізацыйнага камітэта фестывалю. Віцэпрэм'ер Беларусі Аляксандр Косінец, які з'яўляецца старшынёй аргкамітэта фестывалю, зачытаў віншаванне Прэзідэнта Беларусі гасцям і ўдзельнікам Дня беларускага пісьменства.

Як адзначыў Аляксандр Косінец, свята садзейнічае кансалідацыі беларусаў. XV Дзень беларускага пісьменства праходзіць у Год здароўя, у год грамадска-культурнай акцыі «Мы — беларусы!». І гэта — пацвярджэнне таго, што грамадзяне Беларусі ганарацца сваёй краінай. Асаблівыя словы прывітання Аляксандр Косінец адрасаваў гасцінным гаспадарам. Старажытны Барысаў — сучасны еўрапейскі дагледжаны горад, падкрэсліў ён.

*(Заканчэнне на 3-й стар.)*



Фота БЕЛТА.

...У чарговы, ужо 15-ы раз адшумеў, адгрымеў, адзвінеў Дзень беларускага пісьменства. Чым уразіў? Найперш і на жаль — больш чым пільнай аховай (да гэтага нам яшчэ трэба прывыкнуць...); больш чым шырокім размахам; прыбранасцю плошчаў і вуліц, іх рускамоўнасцю... Спёкай... Насычанасцю праграмы.

І, зразумела ж, сустрэчамі — з гарадамі, дзе гэта свята ладзілася раней, з людзьмі.

Слынныя Паставы ў Барысаве прадстаўляла знакамітая майстрыха (і што вельмі прыемна, адданая падпісчыца «Звязды») Лілія Радзівонаўна Зарэцкая. Гэта яна вышыла «дрэва жыцця» свайго роду (6 пакаленняў), гэта яна працуе цяпер над картай раёна (з усімі яго вёскамі, усімі рэчкамі...), гэта яе рукам належыць палатно. Не пашчасціла распытаць пра яго падчас свята ў Паставах. Таму хоць цяпер...

*(Заканчэнне на 3-й стар.)*



Фота БЕЛТА.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

### НЕ ЎЦЁК

Каля вёскі Мокрая Дубрава Пінскага раёна невядомай машынай быў збіты 21-гадовы жыхар в. Каўняцін, які памёр у бальніцы. Вадзіцель з месца трагедыі з'ехаў. Але падчас мерапрыемстваў у адпаведнасці з планам «Перахоп» увагу аператыўнікаў прыцягнуў «Форд-Сіера», і яны не памыліліся. Наезд зрабіў жыхар в. Хатынічы Ганцавіцкага раёна.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.09.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 111,00 |
| 1 еўра | 3 017,46 |
| 1 латвійскі лат | 4 285,86 |
| 1 літоўскі літ | 873,92 |
| 1 чэшская крона | 121,07 |
| 1 польскі злоты | 878,01 |
| 1 расійскі рубель | 83,56 |
| 1 украінская грыўня | 446,30 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 25,2626 |
| 10 UAH | 53,5225 |
| 1000 BYR | 11,9615 |
| EUR | 36,2670 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 08.09.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова


*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*


ISSN 1990 - 763X

### Восеньскае купанне

Быццам бы, ужо купацца пазнавата, але 33-гадовы жыхар Брэста вырашыў паплаваць у вадаёме па вул. Маскоўскай і ўтапіўся.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Навуковы прарыў: ведай нашых!

# «ВЯЛІКІ ВЫБУХ» У МІНІЯЦЮРЫ РАСПРАЦОЎВАЛІ І БЕЛАРУСЫ...



**Заўтра распачнецца эксперымент, маштаб якога можна смела назваць грандыёзным. Будзе запушчаны зверхмагутны паскаральнік часціц — Вялікі адронны калайдар (ВАК), з дапамогай якога вучоныя спадзяюцца наблізіцца да раскрыцця таямніцы паходжання Сусвету.**

Ні па памерах, ні па магутнасці пабудаваны Еўрапейскай арганізацыяй ядзерных даследаванняў (CERN) калайдар сёння не мае аналагаў на планеце. Яго старэйшы брат са Злучаных Штатаў Амерыкі — паскаральнік пратонаў і антыпратонаў, які да апошняга часу лічыўся самым перадавым, па магутнасці саступае Вялікаму адроннаму калайдару ў 8 разоў.

Калайдар уяўляе 27-кіламетровы бетонны тунэль у выглядзе гіганцкага кола дыяметрам некалькі кіламетраў, размешчанага на 100-метровай глыбіні ў наваколлі Жэневы. У ім пад уздзеяннем электрамагнітнага поля будуць разганяцца насустрач адзін аднаму пучкі пратонаў — з рэкорднымі на сёння хуткасцямі і энергіямі (яны будуць сутыкацца 40 мільёнаў разоў за секунду!) Вынікам такога ўзаемадзеяння стане стварэнне шматлікіх другасных часціц, сярод якіх, як спадзяюцца вучоныя, будуць і невядомыя, што існавалі на ранніх этапах развіцця Сусвету. Для іх рэгістрацыі былі распрацаваны чатыры дэтэктары — «пасткі» для другасных часціц.

Першапачаткова (14 гадоў таму) запуск калайдара быў запланаваны на 2005 год, аднак, галоўным чынам з-за недахопу фінансавых рэсурсаў, графік работ даводзілася перагледзець. Папярэднія разлікі затрат аказаліся заніжанымі. Свой «уклад» унесла і інфляцыя. Калі 5-6 гадоў таму агульны кошт устаноўкі і чатырох дэтэктараў меркаваўся ў памеры 4 мільярдаў долараў, то сёння агучваецца сума ў 8 мільярдаў.

*(Заканчэнне на 6-й стар.)*

# БЕЛАРУСКАЯ ДАЛІНА ВЕТРАЎ


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Гэтыя ветракі стаяць у даліне ветраў на нарачанскім беразе каля вёскі Занарач Мядзельскага раёна.*

## Пенсіянер — самагоншчык

Міліцыянеры ў Расонскім раёне ў лесе ля вёскі Забор'е падчас вырабу самагону затрымалі 70-гадовага пенсіянера.

Канфіскавалі і знішчылі 510 літраў брагі, 3 літры самагону і самаробны «міні-завод» для вырабу спіртнога. Вядзецца праверка.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Хутка пахаладае

Каля в. Мельнікі аператыўнікі з Маларыты затрымалі брастаўчаніна, які на «Мерседэсе» перавозіў дэмісезонныя курткі.

Кантрабанда на суму 31 мільён рублёў канфіскавана.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

**Кошелевский сельский исполнительный комитет Новогрудского района Гродненской области**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже земельного участка в частную собственность граждан Республики Беларусь

Аукцион состоится **15 октября 2008 года в 10.00** по адресу: **д. Кошелево Новогрудского района Гродненской области**, здание сельского Совета.

К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, подавшие заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке задаток. Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по вышеуказанному адресу **по рабочим дням с 10 сентября по 9 октября 2008 года включительно с 8.30 до 17.30**.

На аукцион выставляются земельные участки:

кадастровый № 424382404601000076, расположен по адресу: *Гродненская область, Новогрудский район, Кошелевский сельский Совет, деревня Попковичи*. **Площадь — 0,1767 га.** Начальная цена 1163794 белорусских рубля. Размер задатка — 116380 белорусских рублей;

кадастровый № 424382404601000075, расположен по адресу: *Гродненская область, Новогрудский район, Кошелевский сельский Совет, деревня Попковичи*, **Площадь — 0,1601 га.** Начальная цена 1054466 белорусских рублей. Размер задатка — 105450 белорусских рублей.

Целевое назначение — для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Инженерная инфраструктура: природный газ, центральное водоснабжение, 200 м от автодороги Новогрудок — Новоельня, 1,5 км от г. Новогрудка. Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой земельно-кадастровой документации, размещением извещения в средствах массовой информации. Задаток перечисляется в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота до подачи заявления на счет бюджета Кошелевского сельского исполнительного комитета 3600521060006 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код 698, УНП 500563252, назначения платежа 04901. Получатель — ГУ МФ по Гродненской области. Осмотр земельного участка, выставляемого на аукцион, производится по мере необходимости.

Подробную информацию о земельном участке можно получить в сельисполкоме, **контактный телефон 8 01597 92 723**.

Для участия в аукционе **необходимо представить**: заявление об участии в аукционе; заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение задатка; гражданином — копию документа, содержащую его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина — нотариально удостоверенная доверенность. При подаче документов на участие в аукционе граждане и представители граждан **предъявляют** паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Аукцион состоится** при наличии не менее 2 участников.

**Победителем торгов признается** участник, предложивший наиболее высокую цену.

**Внесение победителем** аукциона **платы** за земельный участок производится **в течении 10 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении земельного участка.

УНП 500052670

**ОАО «Минский подшипниковый завод» извещает своих акционеров о проведении 23 сентября 2008 года внеочередного общего собрания акционеров.**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

*1. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.*

Собрание состоится по месту нахождения Общества: г. Минск, ул. Жилуновича, 2, актовый зал ЛБК, начало собрания в 15.00.

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться в рабочие дни (понедельник—пятница) по указанному выше адресу в кабинете платных услуг на центральной проходной ОАО «МПЗ» в период с 12 по 22 сентября 2008 г. с 10.00 до 16.00 (перерыв с 11.50 до 12.25), а в день собрания — по месту проведения собрания.

Регистрация участников — с 14.00 до 14.45 23 сентября 2008 года по месту проведения собрания по предъявлении документа, удостоверяющего личность, для представителей акционеров — документа и доверенности, оформленной в соответствии с нормами законодательства Республики Беларусь.

**Справки по тел.: 246 70 31, 246 70 66.**

Наблюдательный совет ОАО «МПЗ». *УНП 100103346*

# «БЕЛАРУСЬ БЫЛА, ЁСЦЬ І БУДЗЕ САЮЗНІКАМ БРАЦКАЙ РАСІІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На думку беларускага лідара, ужо праз некальні гадоў можна будзе замяніць імпарт сельскагаспадарчай тэхнікі ўласнымі трактарамі і камбайнамі. Дарэчы, такая палітыка праводзіцца і па іншай прадукцыі. «Мы адыходзім ад імпарту многіх прадуктаў, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Аднак патрэбны пэўны час, каб замацаваць адпаведныя пазіцыі». У Беларусі наладжваецца вытворчасць многіх збожжавых і зернебабовых культур, якія раней пастаўляліся з-за мяжы. Да прыкладу, сланечніку, соі, рапсу. Поўнасцю забяспечана патрэба ва ўласным цукры — яго айчынныя вытворцы вырабляюць больш, чым неабходна для ўнутранага рынку. Беларусь адмовілася ад закупак часнаку, цыбулі, асобных відаў садавіны і гародніны. У краіне створана ўласная вытворчасць насення кукурузы. Айчынная перапрацоўваючая галіна скіравана на тое, каб выраблялць канкурэнтаздольную прадукцыю з натуральнай сыравіны.

Перамены закранулі вёску — па словах Аляксандра Лукашэнкі, у Беларусі прыватызаваных чвэрць агульнай колькасці сельгаспрадпрыемстваў. Тры гады таму было прынята рашэнне паўтысячы гаспадарак, якія дагэтуль неэфектыўна працавалі, прапанаваць інвестарам. «Не ўсе тады ахвотна ішлі на далучэнне да сябе калгасаў, затое цяпер меркаванне змянілася», — заўважыў Прэзідэнт. Рэфармаваныя гаспадаркі карыстаюцца такой жа дзяржаўнай дапамогай, як і іншыя сельгаскааператывы, маюць усе ўмовы для прадукцыйнай працы. «Цяпер інвестары ўжо назавуць не адмовіцца ад гэтых земель, — падкрэсліў беларускі лідар. — Асабліва калі ва ўсім свеце такі попыт на харчаванне. Мы не супраць прыватнай уласнасці ў вёсцы, аднак усё трэба рабіць вельмі ўзважана, каб не памыліцца».

У Беларусі павінна быць справядлівая канкурэнцыя і поўная свабода перамяшчэння тавараў і паслуг. Няправільна, калі ў адным рэгіёне «блакуюцца» пастаўкі з іншых. Каб вырашыць гэтае пытанне, неадкладна будуць прынятыя самыя жорсткія меры. На працягу бліжэйшых пяці гадоў у нашай краіне закрыюць усе дзіцячыя дамы, а дзяцей перасяляць у спецыяльныя сацыяльныя вёскі. Дзяржава ўсяляк клапоціцца і аб тых дзецях, якія растуць у «цяжкіх» сем'ях. За ўтрыманне такіх дзяцей (калі бацькоў пазбаўляюць праваў) плацяць каля 40 працэнтаў бацькі. Вялікая ўвага надаецца развіццю сацыяльнай сферы. Паспяхова рэалізуецца праграма дэмаграфічнай бяспекі, падтрымкі сям'і і дзяцей. Дзякуючы такім мерам, павялічваецца нараджальнасць. Даводзіцца да ладу сістэма аховы здароўя — у медыцынскіх установах ствараюцца самыя сучасныя ўмовы для абслугоўвання пацыентаў.

Пекінскую Алімпіяду беларускі лідар лічыць Алімпіядай упушчаных магчымасцяў. Наша каманда хоць і заваявала 19 медалёў, аднак вынікі маглі б быць лепшымі. Як мінімум на яшчэ пяць залатых медалёў. Дарэчы, у сферы спорту Беларусь актыўна ўзаемадзейнічае з Кітаем. Такое супрацоўніцтва будзе надалей развівацца на ўзаемавыгаднай аснове: напрыклад, кітайскія спецыялісты будуць дапамагаць рыхтавацца беларускім спартсменам, якія выступаюць у водных відах спорту. А ў сваю чаргу, беларусы дапамогуць у падрыхтоўцы спартсменаў у складаных у тэхнічных выкананні дысцыплін — напрыклад, як, кіданне молата і штурханне ядра. Развіваецца і масавы спорт, з дапамогай якога ўдаецца змагацца з такім сацыяльным злом, як п'янства.

Асабліва ўважлівыя адносіны ў нашай дзяржаве да вырашэння экалагічных праблем. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, лічыцца, што толькі ў двух краінах у свеце самая чыстая вада, сярод іх у Беларусі. «Мой галоўны прынцып — ні ў якім разе не разбураць прыродную гармонію», — падкрэсліў Прэзідэнт. Для забеспячэння самых сучасных экалагічных патрабаванняў у мадэрнізацыю айчынных прадпрыемстваў укладзены значныя сродкі.

Узаемадзеянне ўлады і прэсы, на думку беларускага лідара, павінна быць узаемапаважлівым. «Я прыхільнік шчырай палітыкі», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

# Ці купляць прадукты з ГМА?

## Кампетэнтны выбар — за спажыўцом...

Дыскусіі вакол генетычна-мадыфікаваных арганізмаў (ГМА) у свеце не суцішаюцца. Адны навукоўцы настойваюць на іх поўнай бяспечнасці і эканамічнай эфектыўнасці. Іншыя, наадварот, выстройваюць даволі пераканаўчую сістэму доказаў, якія сведчаць, што ГМ-прадукты здольныя выклікаць харчовую алергію, анкалагічныя захворванні, генетычныя мутацыі, паталагічныя змяненні ва ўнутраных органах і спрыяць развіццю ў чалавека ўстойлівасці да антыбіётыкаў. І пакуль усе кропкі над «і» ў гэтым пытанні не пастаўлены, права вырашаць, спажываць гэтыя прадукты ці не рызыкаваць, застаецца за спажыўцом. Такой пазіцыі прытрымліваецца большасць краін Еўропы. Праўда, скарыстацца гэтым правам можна толькі пры ўмове атрымання поўнай і праўдзівай інфармацыі аб складзе прадукту...



*Форма знака «Не змяшчае ГМА»*

Беларускае заканадаўства, як і заканадаўства еўрапейскіх краін, таксама абавязвае вытворцаў указваць на ўпакоўцы прадуктаў, ці змяшчаюць яны генетычна-мадыфікаваныя кампаненты. Але, як правіла, гэта інфармацыя наносіцца такім дробным шрыфтам, што заўважыць яе можа далёка не кожны пакупнік. Таму беларускі Урад вырашыў пайсці далей і ўнёс сваёй пастановай дапаўненні ў Правілы ажыццяўлення рознічнага гандлю асобнымі відамі тавараў і грамадскага харчавання.

Як патлумачылі журналісту «Звязды» ў Мінгандлі, з 12 верасня ўсе прадаўцы абавязаны будуць інфармаваць спажыўцоў аб наяўнасці ў прадуктах генетычна-мадыфікаваных кампанентаў. У прыватнасці, у пастанове Савета Міністраў запісана, што ў выпадку наяўнасці ў прадуктах генетычна-мадыфікаваных кампанентаў на прадаўца кладзецца абавязак давесці да ведама спажыўцоў акрамя інфармацыі, якая змяшчаецца на спажывецкай тары, дадатковую інфармацыю аб утрыманні генетычна-мадыфікаваных кампанентаў, указаўшы яе на цэнніках ці іншымі спосабамі: з выкарыстаннем этыкетак, стыкераў, постэраў і г.д. А невыкананне гэтых патрабаванняў будзе лічыцца парушэннем Правілаў гандлю.

Дарэчы, з 1 верасня ў Беларусі ўступіў у дзеянне дзяржаўны стандарт «Харчовыя прадукты. Правілы маркіроўкі знакам «Не змяшчае ГМА». Дадзены тэхнічны кодэкс устанаўлівае правілы добраахвотнай маркіроўкі харчовых прадуктаў, якія не змяшчаюць ГМ-кампаненты, і распаўсюджваецца на харчовыя прадукты, якія падлягаюць абавязковаму кантролю за наяўнасцю ГМА. У гэты пералік уваходзяць у дадзены момант 25 найменняў прадукаў з соі і кукурузы. Падставай для нанясення знака «Не змяшчае ГМА» будуць дакументы з вынікамі лабараторных даследаванняў па якасным аналізе харчовых прадуктаў на адсутнасць генетычна-мадыфікаваных арганізмаў. Цяпер такія даследаванні ажыццяўляюць 13 акрэдытаваных у Сістэме акрэдытацыі Рэспублікі Беларусь лабараторый.

Добраахвотная маркіроўка «Не змяшчае ГМА» можа наносіцца на спажывецкую тару, этыкетку, ярлык, кантрэтыкетку ці кальерэтку. Канкрэтнае месца яе нанясення вызначае непасрэдна заяўнік. Нанясенне знака «Не змяшчае ГМА» можа выконвацца друкам ці ў выглядзе галагафічнай этыкеткі. Знак уяўляе авал белага колеру з зялёнай каймой і надпісам ярка зялёнага колеру «Не змяшчае ГМА» ў цэнтры.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Мільёны ад Сусветнага банка

**Новы дырэктар аддзела Украіны, Беларусі і Малдовы Сусветнага банка Марцін Райзер, які два дні ў Мінску абмяркоўваў ход падрыхтоўкі шэрагу інвестыцыйных праектаў, задаволены супрацоўніцтвам з нашай краінай.**

Яно, па яго словах, развіваецца на добрай і трывалай аснове, дзякуючы планамернаму ажыццяўленню прынятай ў снежні мінулага года адпаведнай краінавай Стратэгіі банка ў Беларусі. Сустрэчы ў Савеце Міністраў, у прыватнасці, з намеснікам прэм'ер-міністра Андрэем Кабяковым, з прадстаўнікамі арганізацый і ўстаноў, якія рэалізуюць інвестыцыі Сусветнага банка, пераканалі яго ў тым, што грошы банка разумна выкарыстоўваюцца нашай краінай.

Таму М. Райзер на сустрэчы з журналістамі не без гонару паведаміў аб станоўчых выніках яго перамоў ва Урадзе аб выдзяленні чарговай пазыкі на мадэрнізацыю сістэм водазабеспячэння Беларусі. Гэты праект разлічаны на 60 млн долараў ЗША. А ў наступным годзе Сусветны банк мяркуе прадаставіць пазыку ў памеры 125 млн долараў ЗША на тэхнічнае пераабсталяванне кацельняў.

М. Райзер таксама паведаміў аб зацікаўленасці Урада Беларусі ў іншых паслугах Сусветнага банка, напрыклад, кансалтынгавых, уключаючы аналіз макраэканамічных паказчыкаў, вывучэнне эфектыўнасці кіравання дзяржаўнымі выдаткамі, кіравання дзяржаўным доўгам. Што датычыцца апошняга, то ў нас, на думку М. Райзера, яго ўзровень дастаткова нізкі. Але, заўважыў дырэктар, апошнім часам назіраўся рост як дзяржаўнага, так і карпаратыўнага доўга банкаў і іншых камерцыйных арганізацый. Відаць, таму Урад выказаў пажаданне Сусветнаму банку накіраваць у нашу краіну яго экспертаў для абмеркавання пытанняў аб кіраванні дзяржаўным доўгам. Гэта просьба будзе хутка выканана, сказаў М. Райзер. Хоць, як ён прызнаўся, пакуль не бачна якіх-небудзь пагроз для эканомікі краіны ад памераў яе дзяржаўнага доўгу.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

# ЯПОНСКАЯ ФІЛАСОФІЯ БЕРАЖЛІВАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

**Анонс**

«Працуй, як чарапаха, а не як трус» — адзін з прынцыпаў менеджменту карпарацыі «Таёта». Даволі дзіўны прынцып, асабліва для аўтамабільнага гіганта, бо здаецца, што энергічны, мітуслівы трус заўсёды будзе хутчэй за чарапаху. Але гэта толькі на першы погляд. Планаванне паспяховага развіцця павінна быць доўгатэрміновым і дасканалым, скіраваным на дасягненне максімальных вынікаў найменшымі намаганнямі. Такі прынцып арганізацыі працэсаў стварэння прадукту атрымаў назву «Беражлівай вытворчасці».

Вось як вышэйшае кіраўніцтва «Таёты» тлумачыць цудоўнае пераўтварэнне нікому не вядомай 50 гадоў таму кампаніі ў лідара сусветнага рынку: «Дасканалыя працэсы з'яўляюцца часткай нашай стратэгіі. Мы дасягаем адметных вынікаў з дапамогай звычайных людзей, якія кіруюць дасканалымі працэсамі. Нашы канкурэнты часта атрымліваюць сярэднія ці дрэнныя вынікі з дапамогай таленавітых людзей, якія кіруюць не дасканалымі працэсамі».

Менавіта на выключэнне з працэсу вытворчасці страт і бесперапыннае яго ўдасканаленне скіраваны намаганні ўсіх супрацоўнікаў беражлівай сістэмы.

Што атрымліваецца на практыцы? Стварэнне выцягваючай паточнай лініі паводле прынцыпу «беражлівасці» на адным з участкаў мінскай кампаніі па вытворчасці шклопакетаў, дало магчымасць не толькі больш дакладна прагназаваць тэрміны выканання заказаў, але і павысіла прадукцыйнасць у 2 разы пры скарачэнні вытворчых затрат у 1,5 раза. Акрамя таго, вызваліла 43 працэнты вытворчых плошчаў. Лічбы ўражваюць. А вось як укараніць прынцыпы беражлівай вытворчасці на сваім прадпрыемстве ці фірме, вы зможаце даведацца на II Міжнародным форуме «Беражлівая вытворчасць: малыя затраты — вялікія эфекты», які пройдзе ў Мінску 3—4 кастрычніка. Яго мэта — абмен вопытам у галіне эфектыўнага зніжэння затрат, павышэння прадукцыйнасці, павелічэнне эфектыўнасці выкарыстання рэсурсаў. Прыкладам паслужаць прадпрыемствы краін СНД, на якіх укараняліся тэхналогіі «Беражлівай вытворчасці».

Арганізатар форуму, кансультацыйная кампанія «Ключавыя рашэнні», сёлета значна пашырыла аўдыторыю і па галіновай спецыялізацыі, і па геаграфіі. Сярод экспертаў і ўдзельнікаў — Дэніс Хобс, аўтар кнігі «Тыпавы план укаранення беражлівай вытворчасці», ЗША, прадстаўнікі прадпрыемстваў СП ТАА «Святавіт», Мінск; «АЎТАВАЗ», Тальяці; ААТ «Каменск-Уральскі Металургічны Завод»; ААТ «Заволжскі маторны завод»; ЭВА «Сігнал», Энгельс, УП «Белкамунмаш», Мінск і інш. Эксперты форуму дапамогуць удзельнікам акрэсліць план укаранення прынцыпаў «беражлівай вытворчасці», выбраць інструменты для яго рэалізацыі, ацаніць вынікі рэалізаваных мерапрыемстваў.

Больш падрабязную інфармацыю аб II Міжнародным форуме «Беражлівая вытворчасць: малыя затраты — вялікія эфекты» можна атрымаць на сайце кампаніі «Ключавыя рашэнні» www.kronsult.org.

Афіцыйныя партнёры: «Сантакі інжынерныя тэхналогіі», «Софтформ», друкарня «Арт-Прынт».

Генеральныя медыя-партнёры: Альфа-радыё, газета «Аргументы і факты».

Афіцыйныя медыя-партнёры: TUT.BY, газеты «Звязда», «Нацыянальная Эканамічная газета», «Рэспубліка», «Топ-Персона», часопісы «Цэны і тавары сёння», «Фінансавы дырэктар», «Тэхналогіі перапрацоўкі і ўпакоўкі», электронны часопіс «Штодзённік», БЕЛТА.

## За незаконнае перасячэнне мяжы — больш жорсткае пакаранне

**Уступае ў сілу Закон Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Крымінальны, Крымінальна-працэсуальны, Крымінальна-выканаўчы кодэксы Рэспублікі Беларусь і Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях». Закон робіць больш жорсткім патрабаванне з парушальнікаў мяжы.**

Новая рэдакцыя часткі 1 артыкула 371 «Незаконнае перасячэнне Дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь» Крымінальнага кодэкса ў новай рэдакцыі выглядае наступным чынам: «Наўмыснае незаконнае перасячэнне Дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь з выкарыстаннем механічнага транспартнага сродку, судна ўнутранага плавання (самаходнага), маламернага маторнага судна, судна з падвясным рухавіком, гідрацыкла, паветранага судна з рухавіком, а роўна наўмыснае незаконнае перасячэнне Дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь іншым спосабам, здзейсненае на працягу года пасля адміністрацыйнага спагнання за такое ж парушэнне, караюцца штрафам, або арыштам на тэрмін да шасці месяцаў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў».

За 2006—2008 гады органамі дазнання па частцы 1 артыкула 371 Крымінальнага кодэкса было ўзбуджана звыш 50 крымінальных спраў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Абзац

■ ААТ «ААБ Беларусбанк» у студзені — жніўні 2008 года выдала студэнтам на аплату навучання крэдытаў на суму больш за Br5,7 млрд, заключыўшы 1 240 крэдытных дагавораў.

**■ Прадстаўнікі Рэспубліканскага біялагічнага заказніка «Спораўскі» (Бярозаўскі раён) занялі першае агульнакаманднае месца на трэцім чэмпіянаце Еўропы па ручным сенакашэнні нізінных балотаў, якое праходзіла ў Польшчы. За тытул пераможцы змагаліся 45 краін, уключаючы ЗША і Канаду. Другое месца ў касцоў са Славеніі, трэцяе — Венгрыі. Пераможцы атрымалі ў якасці прыза газонакасілкі вядомай еўрапейскай фірмы.**

■ Споўнілася 70 гадоў з дня нараджэння вядомага беларускага паэта, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі і прэміі Ленінскага камсамола Анатоля Грачанікава. Памёр паэт у 1991 годзе.

**■ Сапёрна-піратэхнічнае падраздзяленне Жлобінскага раёна тройчы ў мінулыя выхадныя выязджала па фактах выяўлення боепрыпасаў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Так, у вёсцы Лебедзеўка выявілі гранату ў кветкавай клумбе, у вёсцы Косаўка рабочыя пры чыстцы калодзежа дасталі прадмет, падобны на міну. А ў вёсцы Гарочычы Калінкавіцкага раёна артылерысцкую гранату выявіў трактарыст мясцовай гаспадаркі падчас працы на полі. Усе боепрыпасы абясшкоджаныя.**

■ Дырэктар Гідраметцэнтра Расіі Раман Вільфанд назваў змены, што маюць адбыцца ў надвор'і Цэнтральнага рэгіёна Расіі, фантастычнымі — на працягу бліжэйшых чатырох дзён тэмпература ўпадзе на 20 градусаў. Між тым ён заклікаў людзей не адчайвацца: метэаролагі чакаюць яшчэ не адзін перыяд наступлення цёплага надвор'я ў другой палове верасня.

**■ Прэм'ер-міністр Тайланда можа быць адпраўлены ў адстаўку з-за ўдзелу ў кулінарным тэлешоу. Апошнім часам у краіне адбываюцца акцыі пратэсту апазіцыі, удзельнікі якіх патрабуюць адстаўкі ўрада на чале з прэм'ер-міністрам. Аднак той не хоча сыходзіць. Цяпер яго можа адправіць у адстаўку суд: да ўступлення на пасаду ён вёў на тэлебачанні кулінарнае шоу, перадача выйшла некалькі разоў і пасля выбрання на пасаду. А ў адпаведнасці з законам чыноўнікі ў Тайландзе не могуць займацца камерцыйнай дзейнасцю. Калі Канстытуцыйны суд прызнае прэм'ер-міністра вінаватым, той будзе вымушаны пайсці ў адстаўку.**

■ Лагер ваеннага ўзору для выпраўлення закаранелых храпуноў адчыніцца ў англійскім горадзе Бірмінгем. Хоць у гэтай папраўчай установе ўсяго 6 месцаў для «аматараў» пахрапець, арганізатары лагера атрымалі ўжо 200 заявак ад ахвотнікаў прайсці курс лячэння. Пацыентам лагера забараняецца курыць і піць спіртное, ім прапісаны строгая дыета і трэнінг, а таксама жорсткі распарадак дня. Па словах арганізатараў, храп з'яўляецца сур'ёзнай праблемай, якая перашкаджае людзям і тым, хто побач, якасна жыць. Так, сярод пацыентаў — пажылая жанчына, якая храпе так, што ўнукі саромеюцца ездзіць з ёй на адпачынак: бабулін храп чуваць на ўсім паверсе любога гатэля. Некаторыя сужэнцы храпуноў знаходзяцца на мяжы нервовага зрыву з-за пастаяннага храпу сваіх партнёраў.

**■ Амерыканскім вучоным удалося ўзламаць код фермента, які адыгрывае ключавую ролю ў развіцці ракавых захворванняў. Даследчыкі сцвярджаюць, што гэта адкрыццё вядзе да стварэння антыракавых прэпаратаў патэнцыйна новага тыпу. Фермент пад назвай тэламераза — ідэальная мішэнь для хіміятэрапіі, таму што адыгрывае цэнтральную ролю ва ўтварэнні большасці разнавіднасцяў ракавых пухлін, але неактыўны ў нармальных клетках. Гэта азначае, што лекі, якія дэактывуюць тэламеразы, будуць працаваць супраць усіх ракавых захворванняў, прычым з мінімальным пабочным эфектам.**

## Поўны абзац

**■ І ад залішняй вагі ў пэўных сітуацыях бывае карысць — так, жыхар Германіі Рольф Мітэльхаўс застаўся жывым і здаровым пасля таго, як у яго трапіла куля. Яна папросту засела ў тлушчавай тканцы мужчыны вагой у 127 кг. Ён нават не заўважыў, што паранены. Куля проста вывалілася з тканкі, чалавек нават не адчуў болю. Страляў у Рольфа рабаўнік.**

■ 29-гадовы жыхар амерыканскай Флорыды арыштаваны за нашэнне штаноў з нізкай таліяй. Супрацоўнікі паліцыі абвінавацілі яго ў парушэнні грамадскага парадку. Мужчына хадзіў па горадзе ў штанах, з-пад якіх амаль напалову былі бачныя бела-блакітныя сямейныя трусы. Яму свеціць штраф у памеры 150 долараў, а калі ён паўторна выйдзе на вуліцу ў такім выглядзе — турэмнае зняволенне тэрмінам да 30 дзён.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

### АГЛЯД СПАБОРНІЦТВАЎ

Дар'я Ткачэнка (Украіна) вярнула сабе сусветную карону па шашках-100 — яна ў матчы-рэваншу перайграла расіянку Тамару Тансыкужыну.

А юная Дар'я Федаровіч з Мінска ў чэмпіянаце Еўропы сярод жанчын заваявала бронзавыя медалі па класічнай і хуткай гульні ў шашкі-64 і выканала норму міжнароднага майстра. Чэмпіёнкамі ж кантынента сталі малдаванка Алена Міськова (галоўны турнір) і ўкраінка Вікторыя Мотрыч (бліц).

У міжнародным турніры па шашках-100 ў Польшчы майстар ФМЖД Віталь Варушыла ўзнагароджаны трэцім прызам, а першым тут быў міжнародны гросмайстар Эдвард Бужынскі з Літвы.

12-ы рэспубліканскі турнір па шашках-64 «Мар'іна Горка-2008» выйграў міжнародны майстар Яўген Кандрачэнка (Гомель). За ім фінішавалі сталічныя майстры Юрый Файнберг і Вячаслаў Палянскі.

### КЛУБ ШУРПІНА

Як вядома, у футболе існаваў сімвалічны «Клуб Фядотава». Яго членамі былі ігракі, якія здолелі ў чэмпіянатах СССР забіць 100 і больш галоў. Наш жа чытач з Пінска Аляксандр Кагоцька паводле аналогіі пачаў падлічваць заліковавія ачкі, якія атрымалі шашачныя кампазітары ў першынствах Беларусі, пачынаючы з першага (1976 год). Мы паведамлялі ўжо, хто ўзяў рубеж у 100 ачкоў і стаў членам «Клуба Шклудава» (камбінацыйныя праблемы-64) і «Клуба Вітошкіна» (эцюды-64). А вось у жанры задач-64 лідзіруе Аляксандр Шурпін (Клімавічы) — у яго актыве 250,5 ачка, а запаветных 100 ачкоў ён, як і Л. Вітошкін па эцюдах-64, набраў яшчэ ў 1986 годзе па выніках 4-га чэмпіянату рэспублікі (П. Шклудаў па праблемах-64 першым столькі ж ачкоў запісаў на свой рахунак у 1989 годзе). Як аказалася, членамі «Клуба Шурпіна» з'яўляюцца Мікалай Баброўнік (Мазыр) — 213,25, Канстанцін Тарасевіч (в. Спорава Бярозаўскага раёна)— 178,25, Уладзімір Ганчар (в. Пружанка Салігорскага раёна) — 159,75, Барыс Іваноў (Мінск) — 153,75, Леанід Вітошкін (Гомель) — 151,25, Віктар Самарын (Барысаў) —131,25 і Мікалай Зайцаў (Баранавічы) — 120,25.

Астатнія складальнікі задач (31) значна ад іх адстаюць.

Зараз А. Кагоцька (тут яму дапамагае П. Шклудаў) працуе над раздзеламі кампазіцыі па стаклетачных шашках. Хутка мы даведаемся, хто ўзначальвае іх лісты-рэйтынгі.

### 14-Ы ЧЭМПІЯНАТ БЕЛАРУСІ

Пакуль што падведзены вынікі ў двух відах кампазіцыі з чатырох. У іх перамаглі: эцюды-100 — Л. Вітошкін (27,25 ачка), мінчанін Васіль Грабенка (19,5) і Пётр Кажаноўскі з в. Кашэвічы Пінскага раёна (13); задачы-100 — Мікалай Баброўнік з Мазыра (21,25), пінчук Мікалай Крышталь (17,75) і А. Шурпін (12,5).

Пазнаёмцеся з лепшым эцюдам першынства, які атрымаў выдатную ацэнку па змесце (8 ачкоў) і належыць Л. Вітошкіну — гросмайстру і трохразоваму чэмпіёну СССР:



БЕЛЫЯ: 39, дамкі 22, 44, 50 (4). ЧОРНЫЯ: 7, 19, 37, дамка 10 (4).

35 (41AB) 16 (46) 32 (6) 33, 5x. A(15) 16 (37-42) 22-33, 49 (48) 43x. B(42) 16 (46CDVP1) 32 (6) 33, 47x. C (48) 22-27 (25) 39, 5x. D(5) 28 (46) 32, 47x. VP1(47) 38 (6) 33, 5x.

Склад судзейскай калегіі: галоўны суддзя — К. Хайнюк, галоўны сакратар — А. Ляхоўскі, арбітры — Р. Мацкявічус і А. Ляхоўскі (эцюды), У. Рычка і Л. Вітошкін (задачы). Дапамагалі ім кансультанты А. Гімбутас, М. Лепшыч, G. Magelinskas, A. Tavernier, П. Шклудаў.

### «ПАГОДА Ў ДОМЕ»-5

У мінулых выпусках мы аб'явілі пяты конкурс на прызы калектыву Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (кіраўнік Канстанцін Міхайлавіч БАРЭЛЬ) — з нормай першага спартыўнага разраду па шашках. Будуць адзначаны пераможцы конкурсу, яго суддзя і каардынатар, а таксама лепшая рашальніца. А каб стаць першакласным рашальнікам, трэба быць вельмі пільным і не прапусціць выпадкі, калі будуць у пазіцыях пабочныя развязкі альбо якія не развязваюцца. Таму за ўказанне такіх істотных недахопаў

налічваюцца прэміяльныя балы. Норма ж другога разраду — рашыць усе заданні, кожнае з якіх ацэньваецца ў адно ачко.

А цяпер падаём трэцяе заданне — праблему нашага аўтара з Магілёва Дзмітрыя Камчыцкага:



БЕЛЫЯ: b4, c3, c5, e1, e5, f6, g5 (7). ЧОРНЫЯ: a5, b8, d2, g3, h6, h8 (6). Выйгрыш.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рубрыка «Шашкі».

Разгледзьце і такую задумку Д. Камчыцкага, але ўжо ў рамках нашага бліца-40/4:



БЕЛЫЯ: c3, e1, e7, g3, g7, h2, h4 (7). ЧОРНЫЯ: a3, a7, b6, c5, e5, f4, f8, h6 (8).

Пашукайце і тут перамогу за белых.

Пераможцу чакае сюрпрыз ад Анатоля Пярхальскага (Глыбокае) — яго зборнік звяздоўскай рубрыкі «Шашкі» за 2006 год у афармленні мясцовага «ФОТА-цэнтра».

Падрабязнасці

## Для зручнасці паляўнічых працэдура выдачы дзяржаўных пасведчанняў на права палявання спрошчана

У нумары «Звязды» ад 13 жніўня мы коратка, адказваючы на пытанне чытача, расказвалі аб працэдуры замены дзяржаўнага пасведчання на права палявання. Нагадаем, што ў Беларусі зарэгістравана больш за 150 тысяч паляўнічых, многія з якіх пражываюць у сельскай мясцовасці. Як паказала жыццё, менавіта ад апошняй катэгорыі паляўнічых у шэраг арганізацый працягваюць паступаць запыты адносна нюансаў замены памянёных пасведчанняў (апошняя масавая выдача пасведчанняў была ў 1998 годзе, а тэрмін іх дзеяння — 10 гадоў). З гэтай нагоды Міністэрства лясной гаспадаркі палічыла неабходным праз «Звязду» даць больш падрабязныя тлумачэнні адносна гэтай працэдуры.

Так, у сістэме міністэрства створана і працуе рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белдзяржпаляванне», на якое зараз ускладзены функцыі па прыёме спецыяльнага паляўнічага экзамену, выдачы дзяржаўных пасведчанняў на права палявання, стварэнні і вядзенні Адзінага рэестра паляўнічых Рэспублікі Беларусь і рэспубліканскага комплекснага банка даных паляўнічых.

У выніку стварэння Адзінага рэестра паляўнічых і для скарачэння тэрмінаў афармлення дзяржаўных пасведчанняў на права палявання, выкаранення наракання з боку грамадзян у абласных цэнтрах краіны створаны пастаянныя прадстаўніцтвы «Белдзяржпалявання». Яны забяспечаны сучаснымі тэхнічнымі сродкамі, якія дазваляюць аўтаматызаваць выраб і выдачу дакументаў.

Камп’ютарнае абсталяванне на месцах злучана ў лакальную камп’ютарную сетку. Праз інтэрнэт-сувязь з цэнтральным серверам «Белдзяржпалявання» вядзецца перадача даных у рэжыме рэальнага часу. Спецыяльныя праграмы дазваляюць адначасова з вырабам дзяржаўных пасведчанняў на права палявання вырабляць і ўліковую картку паляўнічага, а таксама хутка выпісваць паляўнічыя пуцёўкі з выкарыстаннем інфармацыі, што ўтрымліваецца ў банку даных паляўнічага.

У арганізацыях Міністэрства лясной гаспадаркі створаны камісіі для прыёму спецыяльнага паляўнічага экзамену, у склад якіх уваходзяць прадстаўнікі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, тэрытарыяльных органаў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Для няспыннай работы гэтых камісій была спецыяльна распрацавана і ўстаноўлена ва ўсіх арганізацыях Мінлясгаса камп’ютарная праграма па здачы спецыяльнага паляўнічага экзамену, якая таксама мае магчымасць вываду на друк вынікаў тэставання і архівацыі вынікаў здачы экзамену.

На тэрыторыі нацыянальных паркаў, запаведнікаў арганізавана выязная работа прадстаўніка «Белдзяржпалявання» — па ўзгодненых графіках. У выпадку неабходнасці могуць быць аператыўна выраблены дадатковыя дзяржаўныя пасведчанні на права палявання.

Уся неабходная інфармацыя аб парадку выдачы дакументаў, аплаце дзяржаўнай пошліны на права палявання — агульнадаступная, размешчана на інфармацыйных стэндах Міністэрства лясной гаспадаркі, афіцыйных інтэрнэт-сайтах Мінлясгаса і «Белдзяржпалявання».

Увесь час працуе «гарачая лінія» (8 017 220 47 36) па пытаннях аплаты дзяржаўнай пошліны, атрымання дакументаў на права палявання і іншых пытаннях, што датычацца палявання і паляўнічагаспадарчай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

Для зручнасці грамадзян аддзел выдачы дзяржаўных пасведчанняў (РУП «Белдзяржпаляванне», г. Мінск, вул. Прамая, 22) працуе па асобным графіку: з панядзелка да пятніцы — з 8.00 да 20.00 і без перапынку на абед, у суботу — з 9.00 да 16.00 таксама без перапынку на абед.

Згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, для атрымання дзяржаўнага пасведчання на права палявання, а таксама замены яго па тэрміне дзеяння грамадзянін падае ў Міністэрства лясной гаспадаркі (лясгас, дзяржаўнае вытворчае лесагаспадарчае аб’яднанне, РУП «Белдзяржпаляванне») устаноўленыя пералікам дакументы.

Нагадаем, што для замены дзяржаўнага пасведчання трэба падаць наступныя з іх: заяву з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, грамадзянства, пашпартных даных (серыя, нумар пашпарта, калі і кім дакумент быў выдадзены, месца жыхарства, асабісты нумар), нумара кантактнага тэлефона; дзве каляровыя фатаграфіі памерам 3 х 4 см; медыцынскае заключэнне аб адсутнасці псіхічных захворванняў, алкагалізму, наркаманіі ці таксікаманіі.

Указаныя дакументы грамадзяніну трэба падаць асабіста з прад’яўленнем пашпарта.

Плата за атрыманне дзяржаўнага пасведчання на права палявання, карткі ўліку парушэнняў і аплаты дзяржаўнай пошліны адбываецца ва ўпаўнаважанай арганізацыі Міністэрства лясной гаспадаркі ў памеры адпаведна 1 і 0,5 базавай велічыні, устаноўленай на дзень іх атрымання.

Дзяржаўныя пасведчанні на права палявання выдаюцца грамадзянам у месячны тэрмін з дня прыняцця спецыяльна створанай камісіяй станоўчага рашэння аб іх выдачы.

**Падрыхтаваў Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЦЁПЛЫЯ ДАЖЫНКІ



**У мінулую суботу ў Століне прайшоў абласны фестываль-кірмаш «Дажынкі-2008». Брэстчына ўшанавала пераможцаў жніва, якія разам са сваімі калегамі сабралі 1 млн 300 тысяч тон збожжа. Ураджай для вобласці рэкордны.**

Што датычыцца самога свята, то трэба прызнаць, што з году ў год яно праходзіць па адным і тым жа добра адладжаным сцэнарыі. На мяжы раёна гаспадары сустракаюць гасцей, праводзіцца «Парад пераможцаў», цырымонія ўзнагароджання пераможцаў, канцэрт... Але ў параўнанні з мінулагоднімі дажынкамі сёлетнія маюць вялікі плюс. Цёплае, летняе надвор’е спрыяла добраму настрою ўсіх, хто сабраўся ў Століне. Гэта яшчэ раз гаворыць на карысць таго, што не трэба адцягваць святкаванне на познюю восень: зжалі — можна і гуляць. Праца ж у вёсцы ніколі не канчаецца.

Дажынкі ў нас былі заўсёды і, напэўна ж, застануцца. І калі традыцыйнае народнае свята праводзіцца на дзяржаўным узроўні, то гэта радуе.

Хачу звярнуць увагу на пераможцаў абласных «Дажынак-2008». Сярод раёнаў першае месца прысуджана Баранавіцкаму, бо «ўлічваючы, што Брэсцкі і Бярозаўскі раёны з’яўляюцца кандыдатамі ў пераможцы рэспубліканскага спаборніцтва, прызнаць...» баранавіцкіх хлебаробаў вырашылі ў вобласці. Такім жа чынам пасунулі РУСВП «Дружба», СВК «Ляхавіцкі», ААТ «Белавежскае», ПУП «Моладава-Агра», маўляў, яны кандыдаты на рэспубліку, а іх месца занялі СВК з больш нізкімі паказчыкамі.

Магчыма, я не разумею тут нейкай тонкасці, але калі спартсмену не далі б медаль за перамогу ў сваёй краіне, а сказалі б, што ён з’яўляецца кандыдатам на перамогу ў чэмпіянаце Еўропы, то гэта выклікала б непаразуменне. На мой погляд, пераможца застаецца пераможцам у раёне, вобласці і краіне.

Пераможцамі сярод камбайнераў сталі тыя, хто працаваў на камбайнах «Джон Дзір», а вось маладзёжным экіпажам дасталіся КЗС-10К. Цікава, а калі б пераможцу сярод моладзі Валерыя Пархановіча з СВК «Крошын» пасадзіць на амерыканскі камбайн, то, можа, ён абышоў бы і старэйшых калег?

Наконт дажынак Століну шанцуе больш, чым іншым райцэнтрам. Тут ужо праводзіліся рэспубліканскія «Дажынкі-1996», праз год прайшлі абласныя і вось сёлета яшчэ адны, хоць гэты раён у вобласці не ходзіць у лідарах па намалотах.

Кожнае такое мерапрыемства дае магчымасць гораду добраўпарадкавацца, хоць і пасля рэспубліканскіх дажынак Столін моцна абнавіўся. І на гэты раз у райцэнтры працавалі брыгады будаўнікоў не толькі з розных гарадоў вобласці, але і Мінска. Зроблена многа, асабліва гэта бачна ў цэнтры горада. Фантан з чырвонага граніту, клумбы, сучаснае асвятленне вуліц, адноўлены стадыён і будынкі... адным словам, Століну ў чарговы раз пашанцавала.

Прыгожы райцэнтр, цёплае надвор’е, святочны настрой людзей — свята атрымалася!

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# У ШКЛОЎСКАЙ КАЛОНІІ — ТЭАТРАЛЬНАЯ ПРЭМ’ЕРА

**У папраўчай калоніі № 17 (для асуджаных, якія ўпершыню адбываюць пакаранне) самадзейны драматычны тэатр «Феміда» паставіў п’есу Леаніда Філатава «Пра Фядотастральца, удалога малайца». Рэжысёр і акцёры — зняволеныя, якія адбываюць тэрміны за розныя злачынствы.**

Намеснік начальніка калоніі па папраўчай рабоце падпалкоўнік унутранай службы Аляксандр Галынец лічыць пастаноўку спектакляў новай формай выхавання зняволеных. Тэатр пад актуальнай для сітуацыі назвай «Феміда» ў шклоўскай калоніі арганізаваўся некалькі месяцаў таму.

Ваган Карапецян — кіраўнік тэатра і рэжысёр. Больш за тры гады ён адбывае ў калоніі за махлярства. Яшчэ ў 1970-я атрымаў дыплом тэатральнага рэжысёра, аднак прымяніць веды на практыцы так і не давялося. Нечакана, за кратамі, лёс падарыў яму другі творчы шанц.

— Для прэм’еры я выбраў казку, — расказаў Ваган Жараевіч. — Тут у нас народ асаблівы, і хацелася больш гумару. Цэлы месяц мы штодзень па некалькі гадзін рэпеціравалі. З акцёрамі працаваў, як з дзецьмі, бо зняволеныя — вельмі ранімыя людзі, з імі трэба размаўляць тактоўна.

У спектаклі занятыя 9 чалавек. Галоўную ролю Фядота-Стральца выконвае 27-гадовы Дзмітрый Капытаў, асуджаны за забойства. Перад публікай ён з’явіўся з драўлянай стрэльбай з вялізным глушыцелем.

— Усё гэта рабіў сам, выявіў фантазію, — сказаў акцёр. — «Лімонку» зрабілі з паралону, кінжал — з дрэва.

Фядот выглядае вельмі сучасным стральцом: ярка-чырвоная кашуля і бандана «ў агурках», чорныя палосы пад вачыма, як у кінастужках пра спецназ.

А найбольшае ўражанне на публіку зрабіў Кашчэй Бессмяротны. 40-гадоваму Сяргею Якушаву не спатрэбіўся поўны сцэнічны касцюм: спартыўныя штаны з намаляванымі касцямі «арганічна» дапоўнілі татуіроўкі на тулаве. Каб завяршыць вобраз Кашчэя, акцёру давялося развітацца з прычоскай.

— Мастацтва патрабуе ахвяраў, — каментуе Сяргей Міхайлавіч. — Мне, зразумела, ролю Кашчэя аддалі безагаворачна. І грым не патрэбен. Так, я злы і недзе ўнутры ў мяне іголка! (усміхаецца па-кашчэеўску). Мой герой дапамагае ўсвядоміць, што жыццё — складанае, і трэба змагацца з цяжкасцямі.

Якушаў гаворыць, што з тэатрам час ляціць больш хутка і цікава, і ўсё бліжэй да вызвалення. Ён, дарэчы, адбывае ў калоніі тэрмін за рабаванне. Але далёка не ўсе акцёры адкрыта гавораць пра сваё мінулае.

Напрыклад, выканаўца ролі жонкі Фядота Сяргей Арцёменка настойваў на неўмяшанні гасцей з волі ў сваё асабістае жыццё, затое з вялікім задавальненнем паведаміў: хадзіць на высокіх абцасах трэба асцярожна, спадніца — зручнае ў спякоту адзенне, а маляваць сабе вочы і вусны навучыўся адразу.



— Я ў захапленні ад нашага спектакля, — прызнаўся Арцём. — Ён узнімае настрой — у нас тут гэта важна. Мы таксама людзі!

Натуральна, што спектакль у калоніі ўсё ж адрозніваўся ад звычайнага, нават самадзейнага. З падручных сродкаў давялося рабіць усё, ад дэкарацый да адзення. Для Бла́зана-пацешніка адзенне зрабілі з тканіны для фіранак, пафарбавалі галёшы. Агліцкі пасол выйшаў у жабо з кардону і старанна рабіў выгляд, што паралонавыя парася, яблыкі і агурок — вельмі смачныя.

Вядома ж, рэжысёр аддаў даніну турэмнаму гумару: Фядот па-крутому «кідаў пальцы», Кашчэй выходзіў на сцэну пад «Уладзімірскі цэнтрал», Цар карыстаўся мабільным тэлефонам пад надпіс пра 15 сутак штрафнога ізалятара за захоўванне мабільнага тэлефона, смех у зале выклікалі словы «...май на ўвазе, здам у турму». Пры ўсім гэтым спектакль «Пра Фядота-стральца» глядзеўся весела, не пошла і, здаецца, прынёс сапраўднае задавальненне гледачам.

А рэжысёру Вагану Карапецяну адбываць тэрмін зняволення яшчэ больш за два гады. Ён спадзяецца, што ў яго будзе яшчэ магчымасць паставіць новыя спектаклі.

— Чаму б і не? — усміхаецца рэжысёр. — Гэта для ўсіх нас адрушына. Калі хочаце — настальгія па лепшым жыцці.

— Мне здаецца, што ўсё ўдалося, — сказаў ад імя кіраўніцтва калоніі Аляксандр Галынец. — Дарэчы, у Беларусі ёсць тэатры ў жаночых калоніях і для маналетніх. А вось у мужчынскай — упершыню. Мы вельмі хацелі, каб разам з гэтай вясёлай казкай зняволеныя вярнуліся, калі хочаце, у дзяцінства і пачалі зноў думаць пра сваю будучыню.

**Ілона ІВАНОВА.**
*г. Шклоў.*

### ЗА РУЛЬ — БЕЗ ПАСВЕДЧАННЯ

**Мінулыя выхадныя трагічна скончыліся для некалькіх чалавек, якія сталі ахвярамі ездакоў, што кіравалі аўтатранспартам без вадзіцельскага пасведчання.**

У прыватнасці, паблізу Любані ў пяць гадзін раніцы ў нядзелю 28-гадовы вясковы жыхар, які знаходзіўся за рулём аўтамабіля «Форд», не справіўся з кіраваннем: машына з’ехала ў кювет, дзе ўдарылася ў дрэва. У выніку загінуў сам вадзіцель, а таксама яго 31-гадовы аднавясковец, што знаходзіўся ў салоне. А вось пазбаўлены вадзіцельскага пасведчання ў 2005 годзе 40-гадовы рабочы аднаго з ААТ дадумаўся сесці за руль «Аўдзі» яшчэ і п’яным. Фінал гэтай паездкі — машына каля а паловы дванаццатай дня ў нядзелю апынулася ў кювеце паблізу Дзяржынска і перакулілася. Ахвярай гэтага ДТЗ стаў пасажыр «Аўдзі», 65-гадовы пенсіянер, які сканаў у бальніцы.

**Дзмітрый СТАНКОВІЧ.**

Ну і ну!

### Шчоткай пабіў жонку

У адной з вёсак у Лепельскім раёне 61-гадовы пенсіянер пабіў драўлянай шчоткай 56-гадовую жонку, таксама пенсіянерку. Муж такім чынам нанёс жонцы шмат раненняў. Яе адвезлі ў раённую бальніцу. І што не падзялілі? Сям’я, дарэчы, ні на якім уліку ў міліцыі не стаяла. Узбуджана крымінальная справа.

### Загінуў пры нарыхтоўцы драўніны

У Аршанскім раёне пад вечар у лясным масіве ля вёскі Глінішча на работах па нарыхтоўцы драўніны быў смяротна траўмаваны 43-гадовы рабочы лясгаса. На яго ўпала дрэва. Ад атрыманых траўмаў мужчына памёр. Праверку гэтага жудаснага факта праводзіць мясцовая пракуратура.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Доктар адкажа

## Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

**На гэтым тыдні дзяжурыць на «гарачай лініі» Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць кіраўнікі сталічных медустаноў:**

**8 верасня** — галоўны ўрач 21-й цэнтральнай паліклінікі г. Мінска Вячаслаў Станіслававіч СІЛЬЧАНКА.

**10 верасня** — галоўны ўрач 16-й дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алена Іванаўна КУЛЬБЕДА.

**11 верасня** — галоўны ўрач 25-й цэнтральнай паліклінікі г. Мінска Мікалай Мікалаевіч ЗУБЯЛЕВІЧ.

**12 верасня** — галоўны ўрач 19-й дзіцячай паліклінікі г. Мінска Ірына Вальдэмараўна РАМАНЕНКА.

*У графіку магчымыя змяненні.*

**«ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ» ЎПРАЎЛЕННЯ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ МІНАБЛВЫКАНКАМА (017) 220 20 25:**

**9 верасня:**

**9.00—12.00** — загадчык арганізацыйна-метадычнага аддзела Мінскага абласнога псіханеўралагічнага дыспансэра Канстанцін Міхайлавіч МІНКЕВІЧ.

**14.00—17.00** — галоўны хірург упраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама Анатоль Аркадзьевіч МАРЫНІЧ.

**16 верасня:**

**9.00—12.00** — галоўны ўрач Мінскага абласнога процітуберкулёзнага дыспансэра Андрэй Пятровіч МІЦЬКО.

**14.00—17.00** — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной клінічнай бальніцы Наталля Іванаўна БЯРДЗІЦКАЯ.

**23 верасня:**

**9.00—12.00** — галоўны ўрач Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Дзмітрый Уладзіміравіч ЗАЙЦАЎ.

**14.00—17.00** — намеснік галоўнага ўрача Мінскага абласнога радзільнага дома Тамара Канстанцінаўна АЛЯКСАНДРАВА.

*У графіку магчымыя змяненні.*

Здароўе на талерцы

# МАЛАКО — ПРЫРОДАЙ СТВОРАНЫ НАПОЙ

**Смак малака знаёмы нам з маленства. У грамадстве заўсёды панавала думка, што малако — крыніца здароўя. Нездарма, апісваючы дужага здаравяка, кажуць: «Кроў з малаком!». А клапатлівыя матулі, прыязджаючы ў вёску, стараюцца напаіць малых сырадоем.**

Малако — складаная сумесь, створаная самой прыродай для паўнацэннага харчавання. У ёй сканцэнтравана каля 200 кампанентаў, неабходных для развіцця арганізма: вада (больш як 85 працэнтаў), бялкі (казеін, альбумін, глабулін), тлушчы, вугляводы, вітаміны (А, $B_2$, D і інш.), мінеральныя рэчывы (кальцый, фосфар, калій, натрый) і іншыя мікраэлементы.

Якасць і смак малака ў многім вызначаюцца яго тлустасцю: чым больш тлушчу, тым яно больш смачнае і пажыўнае. Пры «адстойванні» малака тлушч усплывае, утвараючы на паверхні слой вяршкоў. А спецыфічны саладкаваты смак малаку надае лактоза — малочны цукар. (Дарэчы, у некаторых людзей малако дрэнна засвойваецца з-за прыроджанай або набытай (пры некаторых захворваннях органаў стрававання) недастатковасці ферменту лактазы, які расшчапляе малочны цукар. Радзей сустракаецца павышаная адчувальнасць да малочнага бялку.)

Малако — слабы ўзбуджальнік страўнікавай сакрэцыі, таму яно вельмі карыснае для тых, каму патрэбнае ашчаджальнае харчаванне, — хворым на язву і гастрыт з павышанай кіслотнасцю. У малацэ шмат кальцыю, значыць, яно неабходнае і тым, хто пакутуе ад астэапарозу. А паколькі малако ўзмацняе вывядзенне вадкасці з арганізма, яго часта рэкамендуюць пры ацёках. Акрамя таго, малако — незаменны прадукт пры атэрасклерозе, хваробах сэрца, печані і жоўцевага пухіра.

Дарэчы, малако трэба піць «правільна». Непажадана ўжываць малако пасля яды: яно зніжае кіслотнасць і змяншае дзеянне страўнікавага соку на ежу. Каб малако пераправілівалася лягчэй, яго лепш піць нашча, невялікімі глыткамі, даўжэй затрымліваючы ў роце. Калі ж праглынуць яго залпам, ды яшчэ ў вялікай колькласці, то яно можа згусцець у шматкі, якія цяжка пераправліваюцца. Не рэкамендуецца ўжываць малако вельмі халодным: нізкая тэмпература ўскладняе страваванне.

Малако добра спалучаецца з салодкімі фруктамі і ягадамі, крухмалістай агароднінай. Для страўніка-ва-кішачнага тракта вельмі карысныя малочныя мусы, пудынгі, ягады і садавіна з ўзбітымі вяршкамі. Аднак есці іх трэба не пасля сытнага абеду, а ў якасці «перакусу». Апраўданая з пункту гледжання дыеталогіі камбінацыя гэтага напою з адварной бульбай і рознымі крупамі.



Малако лепш не спалучаць са слівамі, салёнай, вэнджанай рыбай і каўбасой. Дыетолагі не рэкамендуюць запіваць малаком салодкія здобныя булкі. У кішэчніку ў гэтым выпадку пачынаецца працэс браджэння, што выклікае метэарызм і болі ў жываце. Да таго ж, такое спалучэнне высокакаларыйнае.

Малочныя і сметанковыя соусы да мяса і рыбы, вядома ж, смачныя, аднак стравы атрымліваюцца вельмі сытныя і могуць нашкодзіць фігуры. Ёсць і яшчэ адна прычына, па якой мясныя стравы не варта спалучаць з малаком. Кальцый, які ўтрымліваецца ў неразведзеным малацэ, зніжае засваенне з мяса жалеза. А гэта актуальна для жанчын, схільных да анеміі.

**Суп аўсяны з яйкам**

*1 л малака, 0,5 л вады, 2 яйкі, 200 г аўсяных круп, 40 г сметанковага масла, цукар, соль*

У падсоленай кіпячай вадзе зварыце аўсяныя крупы, уліце гарачае малако, давядзіце да кіпення, дадайце цукар і соль. Запраўце суп сметанковым маслам і нарэзанымі скрылькамі яйка.

**Мятнае малако**

*150 мл малака, 1 ч. лыжка мятнага сіропу, 15 г вадкага мёду, галінка мяты*

У цёплы мёд дадайце мятны сіроп і перамяшайце. Сумесь крыху астудзіце і ўліце ў яе халоднае малако. Усё старанна ўзбіце. Напой пераліце ў бакал і ўпрыгожце галінкай мяты.

**Кактэйль гарбузова-яблычны**

*150 г тварагу, 2 ст. лыжкі здробненага гарбуза, 1 ст. лыжка надзёртага яблыка, 1 ст. лыжка мёду, 4 шклянкі малака*

Працёрты тварог злучыце з гарбузом і надзёртым яблыкам, дадайце мёд, кіпячонае малако і ўзбіце.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**




# ДЗЯРЖАЎНАЯ ДАПАМОГА СЯМ’І

**Да чэрвеня гэтага года жонка атрымлівала ў ВНУ дапамогу па доглядзе дзіцяці як студэнтка дзённай формы навучання. Сыну 1,5 года. Цяпер яна ВНУ закончыла і дапамогу ёй налічваць перасталі. Нідзе не працуе, як беспрацоўную на ўлік яе не бяруць. Чакаем другое дзіця. Ці мае яна права на дапамогу і дзе яе атрымліваць? Якія выплаты яна можа атрымаць на другое дзіця? Я нідзе пастаянна не працую, зарабляю, выконваючы работы па дагаворах падраду ў розных месцах.**

**Анатоль М.,** *г. Брэст.*

Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем’ям, якія выхоўваюць дзяцей», у вас захоўваецца права на атрыманне дапамогі на сына да дасягнення ім узросту 3 гадоў, аднак за яго назначэннем цяпер трэба звяртацца на іншы адрас. Артыкул 27 названага Закона прадугледжвае, што назначэнне і выплата дзяржаўных дапамог ажыццяўляецца па месцы працы (службы), вучобы (у дзённай форме навучання) маці дзіцяці, а калі яна не працуе і не вучыцца, — па месцы працы (службы) або вучобы бацькі. Часткай 8 гэтага артыкула ўстаноўлена, што асобам, якія выконваюць работы ў адпаведнасці з грамадзянска-прававым дагаворам, а таксама непрацуючым асобам дзяржаўныя дапамогі прызначаюцца камісіямі, якія ствараюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, і выплачваюцца органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароны па месцы жыхарства.

На другое дзіця ваша сям’я таксама будзе мець права на атрыманне дзяржаўных дапамог. Першае — гэта дапамога па цяжарнасці і родах, якая прызначаецца і выплачваецца аднаразова за перыяд з 30 тыдняў цяжарнасці працягласцю 126 каляндарных дзён, а ў выпадку цяжкіх родаў, нараджэння дваіх і больш дзяцей — працягласцю 140 каляндарных дзён. Толькі права на гэтую дапамогу маюць жанчыны, занятыя дзейнасцю, у перыяд ажыццяўлення якой на іх распаўсюджваецца дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне і за іх, а таксама імі самімі ў прадугледжаных заканадаўствам выпадках плацяцца абавязковыя страхавыя ўзносы на сацыяльнае страхаванне. Таксама на дапамогу па цяжарнасці і родах маюць права жанчыны, якія закончылі вучыцца (у дзённай форме навучання) ва ўстановах, што забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі, на працягу 2 месяцаў пасля іх заканчэння (артыкул 5 Закона). Дапамога гэтым жанчынам прызначаецца на падставе лістка непрацаздольнасці і пашпарта. Такім чынам, калі ваша жонка атрымае лісток непрацаздольнасці ў межах гэтага 2-месячнага тэрміну, ёй неабходна будзе неадкладна звярнуцца па атрыманне дапамогі ва ўстанову адукацыі. Дапамога па цяжарнасці і родах гэтым жанчынам прызначаецца ў памеры стыпендыі за кожны каляндарны месяц, але не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах, а жанчынам, якія не атрымлівалі стыпендыі — у мінімальным памеры дапамогі па цяжарнасці і родах (цяпер мінімальны памер гэтай дапамогі складае 112 350 рублёў). За перыяд, за які стыпендыя была выплачана, дапамога па цяжарнасці і родах не выплачваецца. У выпадку атрымання лістка непрацаздольнасці па-за межамі ўказанага 2-месячнага тэрміну дапамога па цяжарнасці і родах прызначана не будзе.

Акрамя гэтай дапамогі на другое дзіця вы будзеце мець права атрымаць дапамогу ў сувязі з яго нараджэннем, якая прызначаецца і выплачваецца аднаразова ў памеры сяміразовай найбольшай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму перад датай нараджэння дзіцяці (цяпер памер гэтай дапамогі складае 1 572 900 рублёў). У выпадку нараджэння дваіх і больш дзяцей дапамога выплачваецца на кожнае дзіця.

Таксама жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, рэгулярна іх наведвалі і выконвалі ўсе рэкамендацыі ўрача на працягу ўсяго тэрміну цяжарнасці, прызначаецца і выплачваецца аднаразова дапамога ў памеры найбольшай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму перад датай нараджэння дзіцяці (цяпер памер гэтай дапамогі складае 224 700 рублёў).

На другое дзіця будзе прызначана дапамога па яго доглядзе да дасягнення ўзросту 3 гадоў. Днём узнікнення права на гэты від дапамогі ў вашым выпадку будзе або дзень, наступны за днём заканчэння перыяду, устаноўленага лістком непрацаздольнасці, або (калі дапамога па цяжарнасці і родах не будзе прызначана) дзень нараджэння дзіцяці.

Дзяржаўныя дапамогі прызначаюцца і выплачваюцца з дня ўзнікнення права на іх, калі зварот па іх назначэнне адбыўся не пазней за 6 месяцаў з дня ўзнікнення такога права. Пры звароце па дапамогі пасля заканчэння гэтага 6-месячнага тэрміну дзяржаўныя дапамогі прызначаюцца і выплачваюцца з дня паступлення заявы.

Дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці і дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўных установах аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, пасля заканчэння 6 месяцаў з дня ўзнікнення права на іх (г.зн. з дня нараджэння дзіцяці) не назначаюцца і не выплачваюцца.

## КРАДУЦЬ!

### ...КАТЭР

Дарагі катэр коштам больш за 30 мільёнаў беларускіх рублёў скралі прама з лафета, што стаяў ля дачнага дома дырэктара фірмы — жыхара сталіцы. Нехта ноччу звёз судна. Адбылося гэта ў Мёрскім раёне, у вёсцы Мурашкі.

### ...РУЖЖО

У Шаркоўшчынскі РАУС звярнуўся па дапамогу дыспетчар раённага аддзела МНС, які паведаміў, што ў яго скралі зарэгістраванае паляўнічае ружжо «ІЖ-27» 12-га калібру і патроны. Высветлілася, што зброю скраў 52-гадовы раней судзімы беспрацоўны. Ён раніцай трапіў у дом выратавальніка праз незачыненае акно. Ружжо канфіскавана. Узбуджана крымінальная справа.

### ...ГАЗАВЫЯ ПЛІТЫ

Адміністрацыя віцебскага домабудаўнічага камбіната паведаміла ў РАУС Першамайскага раёна абласнога цэнтра, што ноччу нехта з жылога дома, які будуецца ў мікраёне Білева-1, скраў 4 газавыя пліты. Зламыснікі знялі запоры з дзвярэй і ўвайшлі ў кватэры. Будаўнічы аб’ект не ахоўваўся. Узбуджана крымінальная справа.

### ...ПРАДУКТЫ

У Глыбоцкім раёне абрабавалі сельскую краму. Ноччу праламалі сцяну і ўвайшлі ўнутр. Скралі спіртное і прадукты харчавання на суму 800 тысяч беларускіх рублёў. Крама абсталяваная аўтаномнай сігналізацыяй, але яна не спрацавала. Міліцыянеры ўстанавілі, што на злачынства пайшоў раней судзімы за крадзяжы 28-гадовы мясцовы жыхар. Яго затрымалі. Для вышуку рабаўніка прымяняўся службовы сабака.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Логозинский сельский исполнительный комитет**

**ПРОВОДИТ АУКЦИОН**

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в Логойском районе Минской области, в том числе:

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Начальная цена, бел. рублей | Инфраструктура |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Добренево | 623284501101000071 | 0,1712 га | 312 650 | Электроснабжение, возможность подключения к водопроводу, гравийно-песчаный подъезд |
| 2 | д. Добренево | 623284501101000072 | 0,1060 га | 193 580 | Электроснабжение, возможность подключения к водопроводу, гравийно-песчаный подъезд |
| 3 | д. Добренево | 623284501101000070 | 0,1042 га | 190 300 | Электроснабжение, возможность подключения к водопроводу, гравийно-песчаный подъезд |
| 4 | д. Сыроевщина | 623284506601000024 | 0,2500 га | 456 560 | Гравийно-песчаный подъезд, электроснабжение, подключение к водопроводу |
| 5 | д. Сыроевщина | 623284506601000025 | 0,2500 га | 456 560 | Гравийно-песчаный подъезд, электроснабжение, подключение к водопроводу |
| 6 | д. Логоза | 623284502601000143 | 0,1817 га | 1 065 970 | Электроснабжение, возможность подключения к водопроводу, газопроводу |
| 7 | д. Зеленый Сад | 623284501601000032 | 0,2367 га | 402 115 | Электроснабжение, возможность подключения к водопроводу |

Примечание: по лотам №№ 1—6 имеются ограничения в использовании в связи с нахождением земельных участков в водоохранной зоне.

Задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с № 3600619090097 в филиале 611 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, МФО 153001518, УНН 600537220, Логозинский сельский исполнительный комитет. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести оплату за земельный участок и возместить расходы в сумме 1 326 710 рублей по каждому лоту, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них.

**Аукцион состоится 16.10.2008 г. в 11.00 по адресу: д. Логоза Логойского р-на, Минская обл., здание сельского Совета.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 13.10.2008 г. включительно до 17.00 по адресу: д. Логоза Логойского р-на, приемная сельского Совета.

***Контактный телефон 801774 56436.***

# МАКСІМАЛЬНАЯ НАГРУЗКА НА СТАРШАКЛАСНІКА — 34 ГАДЗІНЫ

**Апошнім часам у пагаршэнні здароўя школьнікаў каго толькі ні вінавацяць: і медыкаў, якія не сочаць за дзецьмі, і школу, дзе дзеці праводзяць часу нават больш, чым са сваімі бацькамі.**

— Між іншым, здароўе школьнікаў — гэта не толькі медыцынская, але і медыка-сацыяльная праблема, і вельмі шмат у гэтым пытанні залежыць ад сям'і і бацькоў, — перакананая **галоўны педыятр Міністэрства аховы здароўя Алена НЕВЕРА**. — Пагаршэнне здароўя беларускіх дзяцей распачалося ў 90-х гадах і прыпала на гады сацыяльна-эканамічнага крызісу на прасторах краін СНД. Захваральнасць дзяцей павялічылася за дзесяцігоддзе на 26 працэнтаў, а падлеткаў ва ўзросце ад 15 да 17 гадоў — на 39 працэнтаў. Сёння колькасць дзяцей з хранічнымі захворваннямі складае 13 працэнтаў. І калі захваральнасць дзяцей нам удалося калі не знізіць, то хоць бы стабілізаваць, то здароўе падлеткаў працягвае пагаршацца і надалей.

— Ад унутрышкольнага асяроддзя здароўе дзяцей залежыць на 20—30 працэнтаў, а гэта не толькі ўмовы знаходжання дзяцей, але і рэжым арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, вучэбныя нагрузкі, якасць і рэгулярнасць харчавання, псіхалагічны клімат у класе і г.д., — тлумачыць **загадчыца аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ала МАЛАХАВА**. — З 1995 па 2003 год у школьнікаў адзначаўся рост морфафункцыянальных парушэнняў (праблемы са зрокам і парушэнні паставы). Таму акцэнт санітарна-эпідэміялагічнай службай быў зроблены на забеспячэнне школ новай вучнёўскай мэбляй, бяспечнай камп'ютарнай тэхнікай і паляпшэнне штучнага асвятлення рабочых месцаў.

Жорсткая пазіцыя санэпідслужбы дазволіла зменшыць колькасць кабінетаў вучэбна-вылічальнай тэхнікі, што не адпавядаюць санітарным правілам і нормам, з 40,7 працэнта (у 2003 годзе) да 11,7 працэнта. У 65 працэнтах школ былі рэканструяваны сістэмы штучнага асвятлення: устаноўлены новыя лямпы з выкарыстаннем электронных пускарэгулюючых прыбораў і нязначным эфектам мігацення. Дарэчы, нормы штучнага асвятлення рабочых месцаў у школах былі павялічаны да 400 люкс, у той час як у Расіі норма складае 300 люкс. Сёння санэпідслужба змагаецца з выкарыстаннем у вучэбных памяшканнях дэкаратыўных штор і няправільным выкарыстаннем жалюзі, якое змяншае натуральнае асвятленне амаль на 20 працэнтаў.

Да новага навучальнага года было набыта больш як 16 тысяч камплектаў вучнёўскай мэблі. Значна абноўлена мэбля ва ўстановах адукацыі Гродзенскай, Мінскай і Брэсцкай абласцей і практычна поўнасцю — у Мінску. Як вынік — стабілізацыя захваральнасці зроку і парушэнняў паставы ў апошнія чатыры гады.

Па прапанове Міністэрства аховы здароўя быў аптымізаваны рэжым школьных канікулаў — цяпер вясновыя і восеньскія канікулы супадаюць з пераводам стрэлак гадзінніка на зімовы і летні час. У 40 працэнтах пачатковых класаў створаны ўмовы для захоўвання там прыналежнасцяў для ўрокаў працоўнага навучання, выяўленчага мастацтва, спартыўнага адзення, кніг для дадатковага чытання, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для першакласнікаў, якім хатнія заданні не задаюць. Пры будаўніцтве ці рэканструкцыі будынкаў агульнаадукацыйных устаноў такія ж індывідуальныя шафы і ячэйкі трэба прадугледжваць і для навучэнцаў сярэдніх і старшых класаў школ. Плюс неабходна паклапаціцца пра душавыя, каб у дзяцей пасля заняткаў фізкультурай была магчымасць «асвяжыцца»...

**Выкананне хатніх заданняў у 9—11-х класах павінна займаць не больш як тры гадзіны, у 7—8-х — 2,5 гадзіны, 5—6-х — 2 гадзіны.**

Раней шмат скаргаў паступала ў санітарную службу ад бацькоў, дзеці якіх навучаліся на другой змене. Таму цяпер ва ўсіх школах урокі на другой змене павінны завяршацца да 19.30. Вучэбныя заняткі ў школах рэкамендуецца пачынаць не раней чым у 8 гадзін, а аптымальны час для пачатку школьных заняткаў — 9 гадзін раніцы. Заняткі ў першых і другіх класах дазваляецца праводзіць толькі ў першую змену.

Пад увагай санэпідслужбы аказаліся таксама вага і паліграфічнае выкананне школьных падручнікаў і нават вага ранцаў (максімум 600 грамаў — для вучняў малодшых класаў і 700 грамаў — для старэйшых дзяцей). Пачатковая школа ўжо цалкам забяспечана падручнікамі, якія адпавядаюць гігіенічным патрабаванням. Паступова, па меры перавыдання, прыводзяцца ў адпаведнасць з гігіенічнымі нормамі падручнікі для вучняў сярэдніх і старшых класаў школ.

— У гэтым навучальным годзе вучэбная нагрузка на школьнікаў будзе зменшана на 15, а ў старшых класах — на 20 працэнтаў, — паведаміла **галоўны інспектар Міністэрства адукацыі Лілія КУЗНЯЦОВА**. — Аб'ём тыднёвай нагрузкі ў 11-гадовай школе ва ўсіх класах зменшаны ў параўнанні з тыпавым вучэбным планам 12-годкі сумарна на 32 вучэбныя гадзіны. Скарочаны гадзіны на вывучэнне матэматыкі, грамадазнаўства, замежнай мовы, музыкі, фізікі, гісторыі, геаграфіі, выяўленчага мастацтва. Колькасць урокаў фізкультуры таксама скарацілася з трох да двух урокаў у тыдзень. Гэта было зроблена па той прычыне, што субота павінна стаць днём правядзення фізкультурна-аздараўлечнай і спартыўна-масавай работы. Увогуле выключаны са школьнай праграмы вучэбны прадмет «Айчынная і сусветная мастацкая культура», змест якога будзе закладзены ў прадметах гуманітарнага цыкла і ў факультатывах.

Між іншым, на думку Ліліі Кузняцовай, **вучэбная нагрузка залежыць не толькі ад колькасці гадзін, але і ад аб'ёму вывучаемага матэрыялу, ад формаў яго падачы і прафесійнага майстэрства педагога. А таксама ад таго, колькі часу школьнік праводзіць дома за выкананнем хатніх заданняў.** Першакласнікам хатнія заданні ўвогуле не задаюцца. Вучні 2-х класаў павінны выдаткоўваць на выкананне хатніх заданняў не больш чым 1,2 гадзіны, 3-х і 4-х класаў — 1,5 гадзіны. Час, выдаткаваны на выкананне задання па адным вучэбным прадмеце, не павінен перавышаць у 2-м класе 20 хвілін і 30 хвілін — у 3-м і 4-м класах. Аб'ём хатняй работы не можа перавышаць 30 працэнтаў ад аб'ёму работы, што выконвалася ў класе. У хатнюю работу нельга ўключаць заданні, разлічаныя толькі на механічную работу, вельмі груваcткія, цяжкія і непасільныя для самастойнага выканання, а таксама заданні, аб прыёмах выканання якіх вучні не маюць дакладных уяўленняў.

— Заданні, пазначаныя зорачкай, на дом задавацца не павінны, — папярэдзіла Лілія Кузняцова. — Гэта заданні павышанай складанасці, і дзіця можа працаваць над імі толькі разам з педагогам. У 5-х і 6-х класах на выкананне хатніх заданняў адводзіцца максімум 2 гадзіны, у 7-х і 8-х — да 2,5 гадзіны і ў 9—11-х — да 3 гадзін.

Увогуле абавязковая вучэбная нагрузка ў пачатковых класах складае 18—21 гадзіну, у 5—9-х класах — 24—28 гадзін і 27 гадзін — у 10—11-х класах. А максімальная дапушчальная нагрузка (з улікам наведвання факультатываў), у адпаведнасці з Санітарнымі правіламі і нормамі, ва ўсіх тыпах агульнаадукацыйных устаноў аднолькавая і складае 22—24 гадзіны ў 1—4-х класах, 27—33 гадзіны — у 5—9-х класах і 34 гадзіны — у 10—11-х класах.

Адметнасць гэтага года — пераход усіх школьнікаў на базавы ўзровень адукацыі, паколькі ў мінулым навучальным годзе на павышаным і паглыбленым узроўнях тыя ці іншыя прадметы вывучалі 48 працэнтаў навучэнцаў.


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Цяпер для паглыбленага вывучэння таго ці іншага прадмета прызначаны факультатыўныя заняткі. Але факультатыў, не варта забывацца, гэта дадатковая вучэбная нагрузка. У Міністэрстве адукацыі прытрымліваюцца той пазіцыі, што наведванне факультатыва — справа добраахвотная і гэта выбар школьніка і яго сям'і. З чым катэгарычна нязгодная галоўны педыятр Міністэрства аховы здароўя Алена Невера: «Сёння дзеці знаходзяцца ў такіх умовах, што ім не даводзіцца выбіраць. Калі дзіця збіраецца паступаць у ВНУ, то на яго кладзецца нагрузка ў школе, нагрузка на факультатыве, выкананне хатніх заданняў плюс заняткі з рэпетытарамі. Такім чынам, **працоўны дзень старшакласнікаў, якія хочуць прадоўжыць навучанне ў ВНУ, складае 10—12 гадзін**. Гэта мы стварылі нашым дзецям такія ўмовы, мы ўпіхнулі іх у такія рамкі...»

Дарэчы, у Гігіенічных патрабаваннях да ўладкавання, зместу і арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу запісана, што вучэбная нагрузка павінна рацыянальна размяркоўвацца па днях тыдня. А расклад урокаў павінен складацца з улікам рангавай шкалы цяжкасці прадметаў. Заняткі па вучэбных прадметах, якія патрабуюць вялікага разумовага напружання, засяроджанасці і ўвагі (матэматыка, фізіка, хімія і г.д.) не рэкамендуецца ставіць у раскладзе на першым і апошнім уроках. На працягу школьнага дня дазваляецца праводзіць кантрольную работу не больш чым па адной вучэбнай дысцыпліне, прычым на апошніх уроках правядзенне кантрольных работ санітарнымі ўрачамі забараняецца. Увогуле ў школьным раскладзе трэба чаргаваць вучэбныя прадметы, якія патрабуюць статычнага напружання (матэматыка, мова і г.д.) з вучэбнымі прадметамі, якія ўключаюць рухальныя і дынамічныя кампаненты (фізічная культура, танец, музыка, выяўленчае мастацтва і г.д.). Ці выконваюцца ўсе гэтыя патрабаванні?

Ала Малахава прызналася, што рэальна выканаць усе гэтыя пункты даволі праблематычна, аднак параіла бацькам старанна вывучыць расклад урокаў сваіх дзяцей. Калі матэматыка стаіць апошнім урокам на тыдні толькі адзін раз, магчыма, гэта вымушаная мера, але калі тройчы на тыдзень — на гэта абавязкова трэба звярнуць увагу кіраўніцтва навучальнай установы. «Увогуле значную ролю ў захаванні здароўя дзяцей павінны адыгрываць іх бацькі. Сацыяльны дабрабыт сям'і і камфортная псіхалагічная абстаноўка — неад'емныя складнікі дзіцячага здароўя», — рэзюмавала спецыяліст.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**РАНГАВАЯ ШКАЛА ЦЯЖКАСЦІ ПРАДМЕТАЎ У 5—9-х КЛАСАХ:**

**Матэматыка — 12 балаў**
**Замежная мова — 11 балаў**
**Беларуская, руская мова — 10 балаў**
**Фізіка, хімія, інфарматыка — 9 балаў**
**Біялогія — 8 балаў**
**Гісторыя — 7 балаў**
**Геаграфія — 6 балаў**
**Беларуская, руская літаратура — 5 балаў**
**Працоўнае навучанне (тэхналогія) — 4 балы**
**Фізічная культура і здароўе — 3 балы**
**Музыка — 2 балы**
**Выяўленчае мастацтва — 1 бал.**

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

## «З пачатку новага года ўсе школьнікі будуць займацца ў школе ў сваёй вёсцы»

**З вёскі Верасніца Жыткавіцкага раёна ў рэдакцыю патэлефанавалі ўсхваляваныя бацькі мясцовых школьнікаў, маўляў, дапамажыце паскорыць рамонт навучальнай установы.**

**— Рамонт старога будынка школы распачалі яшчэ ў маі, ледзь дзеці скончылі навучальны год. Але за мінулыя летнія месяцы там фактычна нічога не было зроблена, як казалі нам самі будаўнікі, няма грошай. Урачыстую «лінейку» 1 верасня праводзілі побач з руінамі школы, ад якой толькі сцены засталіся. А з 2 верасня 180 школьнікаў пачалі вазіць на аўтобусе ў Тураў за 17 кіламетраў для вучобы ў другую змену. Пакуль возяць бясплатна, але пасля новага года, кажуць, бацькам давядзецца аплачваць са сваёй кішэні гэтыя паездкі дзяцей. Але справа нават не ў гэтым, няхай бы хоць нешта рабілі на будоўлі. Абяцалі, што здадуць аб'ект да снежня, ды толькі ці атрымаецца пры такім стаўленні? — пыталіся ў нас заяўнікі.**

Насамрэч, як высветлілася, сітуацыя з рамонтам школы ў Верасніцах аказалася крыху іншай, чым нам падалі бацькі школьнікаў. Паводле слоў загадчыка раённага аддзела адукацыі Жыткавіцкага райвыканкама Ганны Лукашэвіч, цагляны будынак школы быў пабудаваны яшчэ ў 1960 годзе, прычым па нейкім адмысловым праекце, які не прадугледжваў, напрыклад, наяўнасць сталовай (давялося прыстасоўваць іншае памяшканне). За мінулыя дзесяцігоддзі ўзніклі праблемы і па даху будынка, і па «сталярцы» і інш. Ганна Якімаўна кажа, што ўжо самі бацькі пачалі ўзнімаць пытанне наконт рамонту школы. Таму пасля правядзення ўсіх неабходных абследаванняў была зроблена выснова: будынак сапраўды патрабуе капітальнага рамонту. Фінансы пад гэта былі знойдзены ў мясцовым бюджэце і ў абласным (за кошт крэдыту).

— Правільна будзе гаварыць пра капітальны рамонт, сумешчаны з рэканструкцыяй, бо, згодна з праектна-каштарыснай дакументацыяй, у школе павінны будуць з'явіцца сталовая, спартыўная зала і некалькі вучэбных класаў, — патлумачыла Ганна Якімаўна. — Работы пачаліся з мая, некалькі апошніх тыдняў навучальнага года заняткі для школьнікаў праводзіліся ў памяшканнях музычнай школы, сельскага Савета і праўлення калгаса.

Сапраўды, 1 верасня ўрачыстая «лінейка» прайшла ў Верасніцах побач са сценамі галоўнага корпуса. А з 2 верасня, згодна з рашэннем райвыканкама, школьнікаў 1—2 класаў пачалі вазіць за 4 кіламетры на заняткі ў вёску Запясочча, навучэнцаў 3—11 класаў (130 школьнікаў) — у Тураў у сярэднюю школу № 2, але не за 17 кіламетраў, як сказалі нам заяўнікі, а за 6.

Капітальны рамонт і рэканструкцыя разлічаны на два гады. Але... Стаіць задача да канца гэтага года ўвесці ў эксплуатацыю асноўны корпус з прыбудаванай сталовай, каб са студзеня ўсе школьнікі (больш за 180) ужо маглі займацца ў дзве змены ў роднай вёсцы.

Ганна Лукашэвіч сцвярджае, што ніякіх затрымак і збояў тут быць не павінна.

— Так, і бацькі, і мы хвалюемся з-за марудных тэмпаў работ, але гэта ніяк не звязана з фінансаваннем. На будоўлі сапраўды не хапае рабочых рук, але сувязь тут толькі з малымі заробкамі ў будаўнічай галіне — многія будаўнікі з'язджаюць у тую ж Расію, — сказала Ганна Лукашэвіч.

Ці атрымаецца тады захаваць тэрміны ўводу ў эксплуатацыю галоўнага корпуса і сталовай да канца года? Суразмоўца сцвярджае, што атрымаецца. «Калі падрадная будаўнічая арганізацыя не будзе спраўляцца, будуць прыцягнуты іншыя падрадчыкі».

Дарэчы, пра тое, што плануецца рамонт з рэканструкцыяй, павінны былі ведаць усе бацькі, прычым задоўга да іх пачатку. Можна меркаваць, што званок з крыху скажонай інфармацыяй — толькі праява бацькоўскага хвалявання за сваіх дзетак.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Пад пагрозай... праса

**спрабавалі завалодаць сабутэльнікі грашыма жанчыны, з якой да гэтага мірна за чаркай сядзелі за сталом.**

Уласна кажучы тое, што пасля адбылося днём у адным з прыватных дамоў па 1-м завулку Паўднёвым у Мінску — сапраўднае дзікунства, учыненае, трэба меркаваць, асатанелымі ад моцнага напою наглядна знаёмымі гасцямі 38-гадовай непрацуючай гаспадыні пакоя. Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, напачатку няшчасную ўдзельнікі злачыннага «квартэта» збілі, патрабуючы ў яе 50 тысяч рублёў. Калі ж гэтая «мера» здалася ім занадта мяккай, у справу і пайшоў прас. Мучыцелі не шкадавалі сваёй ахвяры: жанчына трапіла ў бальніцу з закрытай чэрапна-мазгавой траўмай, тэрмічнымі апёкамі пляча, ягадзіц і клубоў. Што ж датычыцца падазроных у гэтым злачынстве, то яны затрыманы праваахоўнікамі. Як высветлілася, здзекаваліся над мінчанкай чацвёра непрацуючых жыхароў Дзяржынска, сярод якіх была і 23-гадовая жанчына, якая раней ужо мела стасункі з законам — была судзімая за махлярства. Іншым удзельнікам гэтай справы 20 і 18 гадоў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## АДНОСІНЫ БЕЛАРУСІ І КІТАЯ — УЗОР МІЖДЗЯРЖАЎНЫХ АДНОСІНАЎ

**Аб гэтым заявіў на сустрэчы са слухачамі, студэнтамі і выкладчыкамі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі пасол Кітая ў Мінску У Хуньбінь.**

Сюды ён завітаў невыпадкова. Паміж Акадэміяй і Нацыянальнай школай кіравання КНР падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве, у рамках якога прадугледжаны навуковыя абмены, сумесныя даследаванні і г.д. У Хуньбінь, у прыватнасці, спыніўся на асаблівасцях функцыянавання кітайскай мадэлі дзяржаўнага кіравання. Пасол зазначыў, што за 30 гадоў рэформаў былі як поспехі і здабыткі, так і памылкі, пралікі. Таму сёлета ў Пекіне сур'ёзна аналізуюць вынікі гэтага 30-гадовага шляху, робяць адпаведныя высновы на будучыню. Сёння на парадку дня паўстала новае пытанне — як лепш прыстасавацца Кітаю да новай міжнароднай абстаноўкі ў свеце? Гэта, па словах дыпламата, складаная задача.

У Хуньбінь выказаў задаволенасць узроўнем адносінаў нашых дзяржаў, якія адрозніваюцца ўстойлівасцю, уражваюць станоўчай дынамікай кантактаў і вялікай ступенню ўзаемаразумення і даверу паміж іх кіраўнікамі. Гэтага ўдалося дасягнуць у многім дзякуючы таму, што мы ніколі не навязвалі сваю волю адзін аднаму, адносіны будуюцца на прынцыпах раўнапраўя і поўнай павагі суверэнітэту.

Невыпадкова апошнім часам, на думку пасла, значна вырас гандлёвы абарот, які ўжо перавысіў мільярд долараў ЗША. Аднак гэта не мяжа, лічыць У Хуньбінь. Значным крокам наперад стане рэалізацыя сумесных праектаў: мадэрнізацыя Мінскай ЦЭЦ-2 і будаўніцтва цэментнага завода. Толькі кітайскі крэдыт на ўзвядзенне апошняга складзе паўмільярда долараў ЗША.

Разам з тым пасол заўважыў, што супрацоўніцтва ў эканоміцы развіваецца не так хутка і плённа, як адносіны ў палітычнай сферы. Сітуацыя можа істотна змяніцца з прыходам на рынак Беларусі вялікіх кітайскіх кампаній, пашырэння паставак якасных тавараў з КНР, а не гандаль тымі вырабамі, якія завозяць «чаўнакі».

У сваю чаргу пасол паабяцаў, што кітайскія дыпламаты будуць усяляк спрыяць збліжэнню двух народаў, пашырэнню культурных кантактаў, узаемных гастроляў творчых калектываў, абмену студэнтамі. У Хуньбінь сказаў, што нядаўна ў Кітаі з поспехам прайшлі Дні культуры Беларусі.

Аб чым толькі ні пыталіся студэнты ў пасла: аб правілах вучобы ў кітайскіх ВНУ, падзеях у Тыбеце, стаўленні да агрэсіі Грузіі, старажытнай кітайскай медыцыне, нядаўняй Алімпіядзе і г.д. І на ўсе пытанні моладзь атрымала шчырыя адказы

**Леанід ТУГАРЫН.**

У п'яным чадзе

## Большасць цяжкіх злачынстваў — на рахунку адурманеных алкаголем людзей

**Генпракурорам Беларусі Рыгорам Васілевічам накіраваны прадстаўленні старшыням аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама аб неабходнасці прыняцця неадкладных мераў па папярэджанні забойстваў і асабліва цяжкіх злачынстваў супраць жыцця і здароўя людзей, паведамілі «Звяздзе» ў Генеральнай пракуратуры.**

На тэрыторыі краіны ў першым паўгоддзі было зарэгістравана 378 забойстваў і 143 наўмысныя цялесныя пашкоджанні, у выніку якіх загінулі 435 чалавек. Як адзначаюць у Генпракуратуры, праведзены ўстановай аналіз прычын і ўмоў учынення гэтых злачынстваў, у прыватнасці, паказвае, што самы высокі ўзровень апошніх на 100 тысяч чалавек зарэгістраваны ў Мінскай і Магілёўскай абласцях. Нязменнай з'яўляецца і тэндэнцыя ўчынення забойстваў тымі людзьмі, якія знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. Так, за паўгоддзе ў стане алкагольнага ап'янення ўчынена 311 (82 працэнты) забойстваў і нанесена 81 (57 працэнтаў) наўмыснае цяжкае цялеснае пашкоджанне, якое стала прычынай смерці пацярпелага.

Між іншым, пракурорскія работнікі заўважаюць, што ў краіне склалася трывожная сітуацыя, якая звязана з алкалізацыяй грамадства, прычым практычна ўсіх узроставых катэгорый: аб'ём спажывання спіртных напояў на душу насельніцтва павялічыўся ў 1995—2007 гадах з 6,7 да 11,74 літра абсалютнага алкаголю (без уліку аб'ёмаў «ценявой вытворчасці» і незаконнага ўвозу ў Беларусь спіртных напояў).

Як высветлілася падчас аналізу, асноўная колькасць цяжкіх злачынстваў учыняецца, у прыватнасці, у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, у прыватных жылых дамах і кватэрах, у зімовыя і вясновыя месяцы, у выходныя дні і панядзелак, у вячэрні і начны час, асобамі, якія знаходзяцца ў стане алкагольнага ап'янення і якія з'яўляюцца блізкімі сваякамі ці знаёмымі пацярпелых; на глебе асабістых непрыязных сямейна-бытавых адносінаў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

**Фонд «Минскоблгосимущество»**
**«10» октября 2008 года в 11.30 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5**

**ПРОВОДИТ АУКЦИОН**

по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности Минского района, и права заключения договоров аренды земельных участков, необходимых для его обслуживания
**На аукционные торги выставляются:**

| | Лот № 1 | Лот № 2 |
|---|---|---|
| **Предмет аукциона** | **Здание амбулатории (инв. № 600/С-93319) и сооружение (забор штакетный) и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания** | **Здание амбулатории (инв. № 600/С-93309) и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания** |
| Местоположение недвижимого имущества | Минская область, Минский район, Колодищанский с/с, п. Колодищи, ул. Полевая, д. 13 | Минская область, Минский район, Роговский с/с, п. Шершуны, ул. Савенко, д. 2 |
| Начальная цена предмета аукциона, рублей | 180 773 201 (в том числе: недвижимое имущество — 41 217 711, право заключения договора аренды земельного участка — 139 555 490) | 57 084 120 (в том числе: недвижимое имущество — 41 475 100, право заключения договора аренды земельного участка — 15 609 020) |
| Сумма задатка для участия в аукционе, рублей | 15 000 000 | 5 000 000 |
| Характеристика недвижимого имущества | Общая площадь 197,3 кв.м. Год постройки — 1968. Одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены бревенчатые, перегородки — дощатые, перекрытия деревянные, крыша шиферная, полы — дощатые, линолеум, электропроводка — скрытая проводка, водопровод — металлические трубы, канализация — чугунные трубы, вентиляция — естественная | Общая площадь 207,6 кв.м. Год постройки — 1935. Одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены бревенчатые, перегородки и перекрытия деревянные, крыша шиферная, полы — линолеум, плитка, электропроводка — открытая проводка, водопровод — стальные трубы, канализация — чугунные трубы |
| Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества | Площадь 0,1344 га, срок аренды земельного участка — 99 лет | Площадь 0,1641 га, срок аренды земельного участка — 10 лет |
| Условия использования земельного участка | Для строительства и обслуживания административно-бытового здания | Для строительства и обслуживания административно-бытового здания |
| Продавец недвижимого имущества | Учреждение здравоохранения «Минская центральная районная больница», расположенное по адресу: Минская обл., Минский район, д. Боровляны, ул. Фрузенская, 1, тел. 505-27-17, 505-28-86 | |
| Арендодатель земельного участка | Минский районный исполнительный комитет | |

**К участию в аукционных торгах допускаются:** юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом — доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем — нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином — паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина — нотариально удостоверенная доверенность.

**ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:**

1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским райисполкомом решения о представлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

2. Внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды.

После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодателем земельного участка — договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу:
**г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224-57-09.**
Последний день подачи заявок 8 октября 2008 г. до 17.00.

Навуковы прарыў

# ВЯЛІКІ ВЫБУХ У МІНІЯЦЮРЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Канца свету не будзе!

Ажыятаж вакол падрыхтоўкі да запуску Вялікага адроннага калайдара падаграваўся прагнозамі надыходу канца свету — як верагоднага наступства правядзення эксперыментаў. У прыватнасці, узгадваліся міні-чорныя дзіркі, якія могуць утварыцца пры сутыкненні пратонаў і паглынуць наш свет. Наколькі рэальны падобны варыянт развіцця падзей, нам расказаў **доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, дырэктар Нацыянальнага навукова-вучэбнага цэнтра фізікі часціц і высокіх энергій БДУ Мікалай ШУМЕЙКА**:

— На маю думку, пры дасягальных сёння энергіях нараджэнне падобных часціц цалкам выключана. Калі ўзгадаць макраскапічныя чорныя дзіркі — іх існаванне было прадказана тэорыяй гравітацыі Эйнштэйна — Гільберта. Згодна з ёй, у космасе могуць быць аб'екты з супермагутным гравітацыйным полем, якое прыцягвае ўсё, што набліжаецца на пэўную адлегласць, любую матэрыю, у тым ліку і электрамагнітнае выпраменьванне. Мы маем назіральныя даныя, паводле якіх і ў нашай, і ў суседніх галактыках існуюць астранамічныя аб'екты, якія можна інтэрпрэтаваць як чорныя дзіркі. Працяй кажучы, тэорыя чорных дзірак дазваляе патлумачыць паводзіны некаторых касмічных аб'ектаў. Аднак не выключана і іншае тлумачэнне, а, значыць, пакуль што адназначнае сцвярджэнне рабіць рана. У навуцы гэта называецца ўказаннем на існаванне, але не доказам. Такім чынам, пакуль што ў нас ёсць тэарэтычнае прадказанне і назіральныя факты, якія ўказваюць на магчымасць існавання макраскапічных чорных дзірак.

Некалькі дзесяткаў гадоў таму было прадказана існаванне падобных мікраскапічных аб'ектаў са зверхвысокай шчыльнасцю, якія таксама могуць прыцягваць да сябе акаляючае рэчыва і неабмежавана нарошчваць сваю масу. Сучасная навука не абвяргае існаванне невядомых элементарных часціц са здольнасцю прыцягваць да сябе матэрыю па механізме макраскапічных чорных дзірак, аднак да гэтай пары няма ніводнага ўказання на існаванне падобных аб'ектаў. Мікраскапічныя чорныя дзіркі — гэта экзотыка нават у тэорыі.

**Ажыятаж вакол падрыхтоўкі да запуску Вялікага адроннага калайдара падаграваўся прагнозамі надыходу канца свету — як верагоднага наступства правядзення эксперыментаў**

Мікалай Максімавіч падкрэсліў, што сістэма бяспекі на калайдары значна больш складаная і не менш надзейная, чым на атамных электрастанцыях ці падлодках. Яна будавалася з улікам сейсмічнай актыўнасці рэгіёна.

## Навошта ён нам патрэбны?

Сучаснае разуменне свету грунтуецца на Стандартнай мадэлі фундаментальных узаемадзеянняў, паводле якой паводзіны матэрыі, часу, а таксама пераўтварэнне энергіі рэгулююць чатыры тыпы фундаментальных узаемадзеянняў: моцнае, электрамагнітнае, слабае і гравітацыйнае.

Моцнае (ядзернае) узаемадзеянне дзейнічае на кароткай дыстанцыі і адказвае за ядзерны ўзровень будавання матэрыі: пратоны і нейтроны ў атамным ядры і кваркі ў складзе пратонаў і нейтронаў утрымліваюцца на сваіх месцах менавіта дзякуючы гэтаму тыпу ўзаемадзеяння. Яго галоўнае прызначэнне ў прыродзе — забеспячэнне стабільнасці атамных ядраў. Па інтэнсіўнасці яно ў 100 разоў мацнейшае за электрамагнітнае.

Электрамагнітнае ўзаемадзеянне рэгулюе паводзіны электрычна зараджаных часціц і часціц, якія валодаюць магнітнымі якасцямі. Яго галоўная функцыя — забяспечваць атамна-малекулярную стабільнасць. Дзякуючы яму існуе электронная абалонка ў атамаў і міжатамнае ўзаемадзеянне ў малекулах.

Слабае ўзаемадзеянне па інтэнсіўнасці на 10 парадкаў слабейшае за моцнае. Яно з'яўляецца галоўным узбуджальнікам нестабільнасці элементарных часціц і адказвае за іх узаемапераўтварэнне.

Чацвёрты тып фундаментальнага ўзаемадзеяння — гравітацыя. Ёй падвергнуты ўсе аб'екты і вядомыя часціцы, нават кванты электрамагнітнага поля — фатоны, якія не маюць масы. Гравітацыя адказвае за касмічны ўзровень будавання матэрыі, яе інтэнсіўнасць на 40 парадкаў меншая за інтэнсіўнасць моцнага ўзаемадзеяння.

З павышэннем энергіі ўзаемадзеяння часціц да сотні Гігаэлектрон-Вольт (у калайдары — магчыма да тысячаў) інтэнсіўнасці слабага і электрамагнітнага ўзаемадзеянняў зроўніваюцца. Атрымліваецца адзінае — электраслабае ўзаемадзеянне прыроды, якое рэгулюе і слабыя, і электрамагнітныя працэсы. Стандартная мадэль фундаментальных узаемадзеянняў грунтуецца на тэорыі Вялікага аб'яднання, паводле якой пры пэўных велічынях энергіі інтэнсіўнасці электраслабага і моцнага ўзаемадзеянняў супадуць.

— Тэарэтычна такое трыадзінае ўзаемадзеянне існавала на пэўным этапе развіцця Сусвету, — расказвае Мікалай Максімавіч.



— Пасля Вялікага Выбуху ад агульнага протаўзаемадзеяння спачатку адасобілася гравітацыя, а потым паэтапна «разгалінавалася» электраслабамоцнае. Указаннем на гэта могуць стаць пэўныя часціцы — так званыя лептакваркі, якія, як мы мяркуем, павінны адначасова валодаць уласцівасцямі і электронаў, і кваркаў.

**З запускам калайдара чалавецтва вырашае комплексную задачу: атрымлівае якасна новыя веды аб месцы чалавека ў прыродзе і аб пабудове самой прыроды, а таксама развівае індустрыяльныя і інфармацыйныя тэхналогіі**

Калі мы зарэгіструем іх — яны стануць пацвярджэннем правільнасці тэорыі Вялікага Выбуху і далейшага пашырэння Сусвету.

Яшчэ больш мы спадзяёмся, што з дапамогай Вялікага адроннага калайдара здолеем вынайсці часціцы, якія нарадзіліся яшчэ раней (у 10 у мінус 43-й ступені секунды пасля Вялікага Выбуху) і былі папярэднікамі лептакваркаў — суперсіметрычныя часціцы. Паводле тэорыі, яны павінны быць партнёрамі па квантавых лічбах звычайных часціц. Вядомыя нам часціцы падзяляюцца на ферміёны і базоны, якія фундаментальна розняцца паміж сабой, а ў суперсіметрыі базоны і ферміёны аб'яднаны агульнасцю якасцяў. Адкрыццё суперсіметрычных часціц пацвердзіць тэорыю існавання адзінага ўзаемадзеяння прыроды на момант нараджэння Сусвету і саму тэорыю Вялікага Выбуху.

Паводле слоў Мікалая Максімавіча, эксперыменты з калайдарам дапамогуць зразумець паходжанне «цёмнай» энергіі, якая 13,7 мільярда гадоў таму абумовіла Вялікі Выбух і цяпер пашырае Сусвет, наблізіцца да разумення паходжання мас часціц (тэарэтычна прадказана існаванне спецыялізаванай часціцы — базона Хігса — якая забяспечвае часціцы масамі і адказвае за іерархію мас), зразумець структуру кваркаў, высветліць, колькі вымярэнняў мела прырода на першых этапах развіцця і шмат чаго яшчэ. А ў перспектыве атрыманыя веды дапамогуць нам навучыцца вызваляць энергію з матэрыі.

## З задачай такога маштабу беларуская прамысловасць не сутыкалася...

Над стварэннем двух універсальных дэтэктараў працавалі 165 навуковых інстытутаў з 50 краін свету. У распрацоўцы і пабудове абодвух з іх прымалі ўдзел беларусы. Напрыклад, у нашай краіне былі пабудаваны ўнікальныя складальнікі каларыметрычнай і магнітнай сістэм дэтэктараў.

— Мне здаецца, што з задачай такога маштабу і складанасці наша прамысловасць раней, магчыма, не сутыкалася, — адзначыў Мікалай Максімавіч. — Назапашаны вопыт, сродкі і метады вытворчасці забяспечылі нам прыток новых тэхналогій і вывелі айчынную вытворчасць на новы ўзровень. Акрамя таго, беларускія вучоныя бяруць удзел у выпрацоўцы і рэалізацыі рашэнняў, актуальных для выпрабаванняў і ўвядзення ў эксплуатацыю найскладнейшых установак, набыцця і апрацоўкі супергіганцкіх масіваў эксперыментальных даных.

Напрыканцы размовы прафесар яшчэ раз падкрэсліў, што з запускам калайдара чалавецтва вырашае комплексную задачу: атрымлівае якасна новыя веды аб месцы чалавека ў прыродзе і аб пабудове самой прыроды, а таксама развівае індустрыяльныя і інфармацыйныя тэхналогіі.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

А на мой погляд...

# Святкавалі, капалі, збіралі...

**У мінулыя суботу і нядзелю да нас зноў вярнулася лета. Умовы надвор'я спрыялі як адпачынку, так і працы. Як асабіста вы правялі выхадныя?**

**Уладзіслаў Рыжыкаў, начальнік аддзела маркетынгу замежнага прадпрыемства «Рэстараны «МакДональдс»:**

— З дзіцем і жонкай былі на Мінскім моры. Не *(смяецца)*, не купаліся, але вельмі шмат гулялі, каталіся на веласіпедах. Лічыце, як за горадам пабывалі *(смяецца)*.

**Людміла Зяньковіч, прэс-сакратар Міністэрства энергетыкі:**

— У выхадныя я, можна сказаць, сумясціла прыемнае з карысным: мы былі ў Барысаве на святкаванні Дня беларускага пісьменства. Усё было вельмі добра, было на што паглядзець. Я цікаўлюся фатаграфіяй, таму была прыемна здзіўлена беларускім часопісам «Фотамагія», а таксама «Нашай прыродай» — паліграфіяй, якасцю здымкаў. Я люблю рабіць падарункі сябрам, што жывуць не ў Беларусі, таму цяпер ведаю, чым іх можна прыемна здзівіць — альбомамі, кнігамі пра нашу краіну.

**Васіль Жук, намеснік галоўнага канструктара па серыйнай вытворчасці Мінскага трактарнага завода:**

— За горадам, на прыродзе. Крыху «прайшоўся» па грыбах, але пакуль іх малавата, думаю, самы час для іх будзе ў наступныя выхадныя. Агародам крыху займаўся, збіраў вырашчаны ўраджай. Сёлета ў нас атрымаліся добрыя памідоры.

**Галіна Бухавец, дырэктар Аюцавіцкай базавай школы-садка Карэліцкага раёна:**

— *(Смяецца.)* Сапраўды, надвор'е вельмі спрыяла правядзенню сельскагаспадарчых работ. Мы вось бульбу капалі. У нас участак 30 сотак, пакідалі іншыя справы, сабралі родных і — за працу. Дарэчы, усе навокал займаліся тым жа. Затое цяпер вольна можна дыхаць *(смяецца)*, усе сілы аддаваць толькі працы.

**Яўгенія Арашкевіч, начальнік ідэалагічнага аддзела Лагойскага райвыканкама:**

— У нас было вельмі шмат працы: у рамках святкавання Дня беларускага пісьменства мы сустракалі ўдзельнікаў прэс-тура — расійскіх журналістаў. Яны наведалі Хатынь, потым пабывалі на гарналыжным комплексе «Лагойск». Па водгуках, расіянам у нас вельмі спадабалася, вось толькі спякотна крыху было *(смяецца)*. Наведвальнікі комплексу нават удзень купаліся, праўда, расіяне не скарысталіся такой магчымасцю, бо былі там ужо ўвечары.

У нашых мясцінах вельмі шмат грыбоў, але выбрацца ў лес пакуль не выпадае. У суботу толькі атрымалася крышачку пабыць з сябрамі на прыродзе.

**Вольга Пашкевіч, начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароны Бярэзінскага райвыканкама:**

— У суботу рабілі рамонт у доме. А ў нядзелю святкавалі 48-ы дзень нараджэння мужа. Загадзя рыхтавалася, склала невялікае віншаванне (*смяецца*). А потым у невялікай кампаніі цудоўна пасядзелі ў альтанцы на ўчастку. Надвор'е, як кажуць, цалкам спрыяла.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

Наш фармат

# ВЯСЕЛЛЕ... НА КОЛАХ



**У мінулыя выхадныя ў Савецкім раёне Мінска адбылося незвычайнае вяселле — веласіпеднае. Менавіта так вырашылі абставіць свой шлюб мінчане Марына Шахава і Павел Лісоўскі — вялікія прыхільнікі веласіпедаў, вандровак і ўсяго, што з імі звязана.**

Маладыя людзі пазнаёміліся некалькі гадоў таму на інтэрнэт-форуме аматараў актыўнага адпачынку «Паехалі!» (www.poehali.net). Шмат разоў ездзілі ў падарожжы-«пакатушкі», удзельнічалі ў спаборніцтвах, мультыгонках. «А потым аднойчы мы зразумелі, што не можам адзін без аднаго — як і без веласіпедаў», — расказалі маладыя.

На вяселле запрасілі сяброў і знаёмых аматараў-байкераў — усё праз той жа форум. Галоўнай умовай для гасцей быў своеасаблівы дрэс-код: чыстыя веласіпеды і шчырыя ўсмешкі, а таксама абавязкова «гукавое суправаджэнне» — веласіпедныя званкі, дудкі, свісткі і г.д. У выніку ў вясельным картэжы налічвалася каля 60 веласіпедыстаў. Для нявесты знайшлі белы шлем і пальчаткі, а таксама спецыяльную «веласукенку», для жаніха — адпаведна чорны шлем, пальчаткі і «веласмокінг». Пасля цырымоніі ў ЗАГСе — цалкам традыцыйнай — маладыя станцавалі «велавальс». Маршрут картэжу пралягаў не праз традыцыйныя месцы прыпынкаў для вясельных фота, а быў тэматычным — маладыя з сябрамі фатаграфаваліся ля кінатэатра «Кастрычнік», дзе знаходзіцца скульптура паштальёна з веласіпедам. Адразу пасля святкаванняў Павел і Марына адправіліся на два тыдні ў вясельнае падарожжа ў Арменію — зразумела, на веласіпедах.



Фота Вольгі ЛАСКІ.

...Пачатак новага — сумеснага — жыцця ўсе пары абстаўляюць па-рознаму, але з аднолькавым жаданнем зрабіць свята незабыўным. У Лідзе, напрыклад, аднойчы вяселле суправаджаў картэж... з малакавозаў. У Чалябінску ў некаторых вяселлях бярэ ўдзел сам вялікі камбінатар Астап Бендэр (дакладней, загрыміраваны акцёр) з лозунгам: «Ударым па бездарожжы шчаслівым шлюбам!».

А яшчэ ў маладых папулярныя паветраныя шары, цеплаходы, коні, у тым ліку і жалезныя, масавыя касцюмаваныя стылізацыі пад розныя эпохі. Вось і велавяселлі, якія пачаліся ў Мінску некалькі гадоў таму, набіраюць усё больш прыхільнікаў. Галоўнае — каб на шчасце!

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

Прыгожае жыццё

# Міс Сілікон, Міс Сланіха...

## І іншыя тытулы для каралеў

**9 верасня ў свеце адзначаецца Міжнародны дзень прыгажосці. Праўда, калі ў значнасці самога гэтага дня ніхто не сумняваецца, то прыгажосць паўсюдна разумеюць па-рознаму. Прапануем вашай увазе самых незвычайных каралеў прыгажосці:**

### «МІС СВІТАНАК»

Кожны кастрычнік у Перу выбіраюць «Міс Світанак». Гэты конкурс цалкам недаступны для гледачоў. Справа не ў тым, што ўсе ўдзельніцы — пачвары. Проста конкурс праходзіць у жаночай турме ў сталіцы краіны, Ліме. Да ўдзелу дапускаюцца толькі тыя дзяўчаты, якія прыстойна сябе паводзяць і рэгулярна наведваюць сеансы псіхатэрапеўта. Праўда, у якасці галоўнага прыза пераможцы не скарачаюць тэрмін пакарання, але затое ўручаюць карону. Коку Касусарэ з Нідэрландаў, напрыклад, атрымала яе з рук сваёй папярэдніцы Розуму Хумсры. Што адметна — абедзве «Міс Світанак» трапілі за краты за кантрабанду наркотыкаў.

### «МІС ПРЫГОЖЫЯ НОЖКІ»

Уладальніца гэтага тытулу Марына Сіменавіч упэўненая: шурпатым пяткам, нявымытаму паміж пальцамі, не кажучы ўжо аб грыбковых захворваннях на ступнях, няма месца ў гэтым свеце. Уладальніца самых дагледжаных у свеце ног дбайна паліруе і шліфуе пазногці, каб, крый божа, не было вострых вуглоў. Самыя загрубелыя месцы яна неміласэрна трэ пемзай, але, праўда, праз дзень. Таму ў яе ўсё-ткі застаецца час, каб наведваць лекцыі ў ВНУ.



### «МІС ЦУКЕРКА»

Б'янка Гротчар уступіла ў спаборніцтва са 160 дзяўчатамі, каб стаць новай Міс Цукерка. На цукерачным балі ў Венскай канцэртнай зале 23-гадовую студэнтку сіналогіі ўзнагародзілі 648 пакункамі вафель з ляснымі арэхамі: роўна столькі дзяўчына важыць у «вафельным эквіваленце». Свой прыз Б'янка перадала ў дзіцячы дом.

### МІС СВЕТУ СЯРОД ГЛУХІХ

Пасля абвяшчэння вердыкту, вынесенага журы, і радасных крыкаў публікі пераможцы разнастайных конкурсаў прыгажосці звычайна мармычуць штосьці накшталт: «Не магу паверыць... Я, мабыць, недачула?». Але гэта не датычыцца Яны Навеліч з Сербіі. У момант свайго трыумфу дзяўчына не вымавіла ўвогуле нічога. Проста таму, што 17-гадовая глуханямая Яна перамагла ў конкурсе Міс Свету сярод глухіх. Што не перашкодзіла прыгажуні свяціцца ад шчасця, а таксама атрымаць буйны грашовы прыз.

### «КАРАЛЕВА ПРЫМІРЭННЯ»



Вы ж не думалі, што афрыканскія плямёны далёкія ад цывілізацыі? Нават у іх праводзяцца свае конкурсы прыгажосці. Вось, напрыклад, шаснаццацігадовая Патрыцыя Какуко стала Кеййойскай Каралевай Прымірэння. Гэты конкурс праводзіўся ў Кеніі сярод плямёнаў, якія здаўна варагуюць паміж сабой: Пакот, Туркана, Мараквет і Карамоя. Вось вам жывы доказ таго, што прыгажосць можа выратаваць — калі не ўвесь свет, то мір паміж людзьмі.

### «МІС СНІД — НЕ КЛЯЙМО»

На жаль, менш за палову афрыканскіх дзяўчат ва ўзросце ад 15 да 24 гадоў ведаюць, што не толькі добры настрой можа быць заразным. Сінцыя Лесхома была ўпэўненая: каб заставацца здаровай, дастаткова быць проста сімпатычнай і разумнай. Сярод 12 удзельніц конкурсу за званне «Міс СНІД — не кляймо», які праводзіўся ў Батсване, суддзі абралі менавіта яе. Усяго праз тры месяцы пасля перамогі, напрыканцы 2006 года, Сінцыя памерла ў канадскім шпіталі.

### «МІС СЛАНІХА»

На гэтае званне ніколькі не пакрыўджаная Тарнарын Хансаванг — студэнтка вагой у 110 кілаграмаў, якая перамагла ў аднайменным конкурсе прыгажосці і заваявала прыз у памеры 1270 долараў ЗША. Абавязковай умовай удзелу ў ім з'яўляецца залішняя вага ў дзяўчат — канкурсанткі, лягчэйшыя за 80 кг, на подыум не выпускаюцца. Цырымонія ўзнагароджання пераможцаў праходзіла ў сапраўдным вальеры для сланоў — у заапарку на захадзе Бангкока. Асобны прыз быў уручаны самай важкай з удзельніцы — 182-кілаграмовай Танханок Мекіў.

### «МІС ЦІФАНІ»

Пад гэтай прыгожай назвай хаваецца зусім не славутая кампанія — вытворца ўпрыгажэнняў, і нават не конкурс пад яе патранажам. Складана нават сцвярджаць, што гэты конкурс, які праходзіць у Тайландзе, мае дачыненне менавіта да жаночай прыгажосці. Бо выбіраюць у ім самага прыгожага... транссэксуала. Ці сапраўдныя «прыгажуні» дэфілявалі па сцэне, высвятляецца толькі ў чарзе ў прыбіральню.



### «МІС ЗЯМЛЯ»

Каб годна насіць гэты тытул, трэба быць не толькі прыгожай дзяўчынай, але таксама грамадскай актывісткай. У сферу абавязкаў цяперашняй «Міс Зямля» Кволы Ясеніі Эрнандэз Эскабар, напрыклад, уваходзіць рэклама турыстычных паездак у розныя краіны свету, а таксама ўдзел у розных праектах, прысвечаных абароне навакольнага асяроддзя.

### «МІС ФІТНЭС»

Міжнародны конкурс пад такой назвай праходзіць у Лас-Вегасе. Прычым мужчыны на яго дапускаюцца толькі ў якасці гледачоў у зале, а за сцэну — ні пры якіх



абставінах. Справа ў тым, што некалькі гадоў таму адзін разумнік вырашыў зрабіць з дапамогай мабільніка фота канкурсантак, якія пераапраналіся да чарговага выхаду... Ачуняў мужчына толькі ў траўмапункце. «Так, у нашых дзяўчат рука цяжкая, і кожная можа за сябе пастаяць», — пацвярджае «Міс Фітнэс Алімпія» С'юзі Кэры.

### «МІС РАДЭО»

Публіка, якая сабралася ў гатэлі The Orleans у Лас-Вегасе, так і не заўважыла, што 21-гадовая пераможца конкурсу «Міс амерыканскае радэо» носіць парык. Лысая галава дзяўчыны — гэта не даніна модзе і не помста кагосьці з саперніц, а наступствы хіміятэрапіі. Зрэшты, гэтага ніхто не ўбачыў пад шыкоўным каўбойскім капелюшом. І нават той факт, што дзяўчына носіць капялюш не здымаючы, нікога не здзівіў — усё ж менавіта вытворца такіх капелюшоў, кампанія Bailey, выступае галоўным фундатарам конкурсу.

### «МІС ШТУЧНАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ»



У словах падзякі пераможцы конкурсаў, як правіла, прыгадваюць сваіх бацькоў, сяброў, якія іх падтрымлівалі, і, вядома ж, Госпада Бога. Але толькі не Фэн Цян. «Я ніколі не змагла б выйграць, калі б не мае пластычныя хірургі», — сказала 22-гадовая дзяўчына пасля таго, як на конкурсе ў Кітаі ёй прысудзілі тытул Міс «Штучная прыгажосць». Злыя языкі, аднак, не без падстаў называюць гэты конкурс інакш — «Міс Сілікон». Фэн пабывала на стале пластычнага хірурга чатыры разы: мяняла разрэз вачэй і форму шчок, а таксама карэктавала форму твару і рабіла ліпасакцыю жывата. Увогуле да ўдзелу ў конкурсе дзяўчаты дапускаліся толькі пры наяўнасці медыцынскай даведкі ад хірурга. Дарэчы, прызавыя грошы — 50 тысяч юаней, або прыкладна 6 тысяч долараў — Фэн таксама збіралася патраціць на чарговую аперацыю — ці то паўторна выдаліць рэшткі тлушчу, ці то зрабіць ін'екцыю ботаксу ў вусны... Як кажуць, няма мяжы дасканаласці — абы грошай хапіла.

### «МІС ВІРТУАЛЬНЫ СВЕТ»



Міс свету не з плоці і крыві, а выключна з найдрабнейшых кропак выявы — пікселей — вырашылі знайсці італьянцы. Менавіта яны надумалі арганізаваць і правесці першы ў сваім родзе конкурс віртуальных прыгажунь: Miss Digital World. Свае работы, трохмерныя мадэлі, даслалі некалькі дзесяткаў прафесійных дызайнераў. Летась пераможцай стала стварэнне, прыдуманае мастаком Марыё Каламітам. Цемнаскурую Еву цяжка назваць адпаведнікам эталону прыгажосці: у яе дзве штучныя рукі і адно шкляное вока. Тым не менш, можа, гэта будучы ідэал трэцяга тысячагоддзя?

**Падрыхтавала Ліна МАЛІНІНА.**

**Гаспадар самай прыгожай Давыд-Гарадоцкай сядзібы Антон Махнач — не толькі выдатны кветкавод і добры гарманіст, як бачна на фотаздымках. Мала хто ведае, што будучы маракам-падводнікам, Антон Махнач абышоў на субмарыне ўвесь зямны шар. Такіх падводнікаў у Беларусі толькі тры. А яшчэ Антону Іосіфавічу давялося ліквідоўваць наступствы аварыі на Чарнобыльскай АЭС літаральна з першага тыдня катастрофы. Цяпер ён пенсіянер і мае дастаткова часу радавацца кожнай кветачцы на сваім агародзе. За высокую культуру агародніцтва і прыгожы выгляд сядзібе Антона і Святланы Махначоў гарадскім Саветам нададзены ганаровы тытул «Дом узорнага парадку».**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



# АНТОНАВА СЯДЗІБА







## Дзённік бландзінкі

### ДЗЕД МАРОЗ

Для мяне ён Дзед Мароз... Справа ў тым, што пару гадоў таму я святкавала Новы Год (адпаведна 29 ці 30 снежня) у адным невялікім, але дружным (тады!) выдавецтве. Хлопцы на чале са Зміцерам Вішнёвым пабеглі за каньяком, а вярнуліся... з Дзедам Марозам. Ён быў убраны ў касцюмчык, цвярозы і вельмі абаяльны. Толькі нейкі маленькі. «Ганна, Ганна, гэта я табе знайшоў Дзеда Мароза»... — шчыра радаваўся Зміцер, а Дзед кожнаму з прысутных прачытаў асабістыя вершаваныя імправізацыі-пажаданні. Праз нейкі час літаратары захацелі застацца на самоце, і Дзед тактоўна сышоў.

Гаварылі, што ў яго амплуа госця на чужых фуршэтах па святах, а так ён сядзіць каля царквы.

Сама ж я яго сустракаю ў раёне плошчы Незалежнасці, дзе ён... ну так, так — чытае вершы тым, хто яму спадабаецца.



### СПЁКА І ГУМАНІЗМ

У Беларусі такая спёка, што цэлы дзень думала пра гуманізм...

Прызнаюся, даўно лаўлю сябе на думцы, што хачу забіць адну бабульку. Не працэнтніцу, а жабрачку. Стаіць яна каля пераходу на Кастрычніцкай ужо гадоў дзесяць і добрыя студэнткі-філфакаўкі ёй першыя гады падаюць. Сківіцаў у яе няма, таму выраз твару што ні ёсць самы «смірэнны» — як тут не падаць?

Аднойчы чакала сястру і засякла, што за адну хвіліну ёй аддалі грошы пяць чалавек, па адной тысячы... Падлічваць жабрачыя прыбыткі — справа не мая, а вось з сумай, якая дастаецца за паўдня, я выпадкова азнаёмілася.

А была справа так...

Пайшла ў абед у «Карону» па кальмар. Падышла да касы, а там бабульку-жабрачку (праўда, не з Кастрычніцкай, а з Маскоўскай) дзяўчынка-касір разлічвае... Яна ёй усе тавары прабіла, і тут бабулька пачынае енчыць-прычытаць, маўляў, толькі б грошай хапіла!

Я спачувальна на яе гляджу, «прабівае» мяне на гуманізм. І думаю: «Ну не хопіць — даплачу...» І тут я чую суму — сто чатырнаццаць тысяч рублёў (каля 50 баксаў). Гляджу на яе вазок — сама ж я з кошыкам хаджу! — а там проста даверху ўсяго, а зверху італьянскі батон з зелянінай і часнаком. Мякка кажучы, не танны хлеб!

Бабулька дастае цалафанавы пакецік з грашыма, пасля з другой кішэні — грошы, але без пакеціка, пасля яшчэ аднекуль... І ўвесь прылавак завалены дробнымі купюрамі так, што прадавачку не відаць!

Але ў «Кароне» мілыя касіркі. Дзяўчына з анёльскай усмешкай спакойна ўсе грошы расклала на стосікі, павыпрамляла і стала лічыць. Маё цярпенне скончылася, і я перабегла ў суседнюю касу. Чарга падышла якраз, калі касірка скончыла падлік. Яна радасна паведаміла, што ў бабулі сто дваццаць тысяч, выдала ёй шэсць тысяч рэшты і пракаментавала: «Каб вы гэтую драбязу не насілі, я вам дам больш буйнымі — пяцітысячную і тысячную купюры...»

Бабця іх бярэ і гаворыць:

— А дзе мае семдзесят тысяч? Я іх дастала з кішэні, а з другой пяцьдзесят... А ты абабрала бедную старую жанчыну!

І давай верашчаць на бедную касірку...

Мне шчыра было шкада дзяўчыну.

Падазраю, што пасля гэтага выпадку яе гуманізм скончыцца раз і назаўсёды.

### ПАКАЛЕННЕ

Саджуся ў аўтобус на плошчы Перамогі.

Каля мяне на крэсле маленькая дзяўчынка. Яны з мамай і бабуляй прыехалі ў Мінск у госці — гэта я з размоў даведалася. І раптам яна спалохана:

— Ужас, ужас! Кто-то разжег огонь!

Увесь аўтобус лянiва — спёка рэдкая! — паварочвае галаву да Вечнага агню. Мама спрабуе яе супакоіць:

— Я тебе потом расскажу, почему он там горит...

Дзяўчынка настойвае, мама ўпіраецца.

Тады малеча голасна і глыбакадумна заўважае:

— Это для того, чтобы нам было еще ЖАРЧЕЙ!

Усім аўтобусам усміхнуліся.

Цікава, думалася мне пасля, няўжо сапраўды нарэшце вырасла пакаленне, не абазнанае ў сімволіцы манументальнай прапаганды савецкай эпохі? Ці можа жывуць яны там, дзе гэтую сімволіку цалкам прыбралі?

Смешна, але ў мяне ўражанне, што мне пра агні і зорачкі расказвалі з пялюшак. Дакладна, з дзіцячага садка.

Расце зусім іншае пакаленне...

### «ЖЫВЫ ЖУРНАЛ» як жыццё

Чытаю запісы сваіх інтэрнэт-сяброў... Народ у інтэрнэце пераважна малады, таму праблемы сесій і каханняў — на першым месцы. Ён кінуў мяне, я кінула яго... Іншым разам не паспяваеш зафіксаваць — твая віртуальная сяброўка сумуе па старым кавалеры, ці ўжо па новым? Але гэта радасны сум дваццацігадовых....

І зусім мала допісаў тых, каму за трыццаць... Некалькі ніколі не бачаных мной, але знаёмых па інтэрнэце жанчын змагаюцца за жыццё. Без ляманту, слёз, іранічна яны расказваюць пра праблемы зусім іншага плана. Згубіла прытомнасць, вярнулася з аперацыі, праходжу рэабілітацыйны курс...

І мне страшна і сумна. Не толькі таму, што я нічым не магу дапамагчы. Але і таму, што ўсведамляю — паміж першымі і другімі адлегласць не большая, чым пятнаццаць гадоў.

**Ганна КІСЛІЦЫНА.**

## Крымінал, здарэнні

### На аўтастаянках у цеснаце, але не ў крыўдзе

Калі глядзець з розных пунктаў гледжання. Для ўладальнікаў легкавушак, якія часова прапісаліся на стаянцы ЧСУП «Аўта-Глобус-плюс», што ў Гомелі, там цесна. Бо яна разлічана на 98 месцаў, а іх тут 169. Каму гэта не крыўдна — гадаць не трэба. Як і ў наступным выпадку: 26 легкавушак, што «адпачывалі» на аўтастаянцы прадпрыемства «УКБ-камплектацыя», не былі занесены ў журнал уліку. Гэтыя і іншыя факты былі ўстаноўлены супрацоўнікамі камітэта дзяржкантролю Гомельскай вобласці ў час праверак васьмі аўтастаянак у абласным цэнтры, Светлагорску і Мазыры. І паўсюдна — парушэнні, носьбіты якіх зараз чухаюць патыліцы: давядзецца плаціць штраф.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### Хто спаліў біятуалеты?

Нядаўна мы расказвалі аб тым, што ў Рэчыцы нехта знішчыў адразу некалькі біятуалетаў. І вось гісторыя паўтарылася. На гэты раз у Гомелі. Вандалы (іншага слова і не падбярэш) пусцілі ў дым сем біятуалетаў, якія знаходзіліся ў цэнтры горада, каля цырка і фантана, дзе па вечарах збіраецца шмат моладзі.

Каму перашкаджалі гэтыя патрэбныя аб'екты, неабходна высветліць. Дарэчы, яшчэ раней нехта ўкраў чатыры такія кабіны, якія знаходзіліся на канцавых прыпынках грамадскага транспарту. Астатнія ж (а іх было ўстаноўлена ў горадзе 50) невядомыя зламыснікі пераварочваюць, крышаць, размалёўваюць непрыстойнасцямі. Весяляцца вандалы? Дажыліся...

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### Што заслужыў, тое і атрымаў

Нядаўна суд Ленінскага раёна сталіцы на пяць з паловай гадоў адправіў у калонію строгага рэжыму 40-гадовага мужчыну. За плячыма ў яго — 15 гадоў «зэкаўскага» стажу. Чарговы тэрмін ён «зарабіў» двума нажавымі раненнямі, якія нанёс мінчаніну. Апошні разам з прыяцелем вырашыў пасля працоўнай змены на адным з гарадскіх прадпрыемстваў папесціць сябе ячменным напоем. П'яны рэцыдывіст, які праходзіў міма магазіна, прыйшоў у лютасць, убачыўшы незнаёмых яму людзей, якія распіваюць піва на «яго» тэрыторыі. Грозна заявіўшы: «Я — гаспадар гэтай вуліцы!», ён запатрабаваў тлумачэння. Убачыўшы, што яго словы ўсур'ёз не ўспрыняты, праз некалькі хвілін дастаў нож...

Міліцыянеры Ленінскага аддзела Дэпартамента аховы МУС Беларусі аказалі пацярпеламу першую меддапамогу і выклікалі для яго «хуткую». Яны ж сумесна з участковым інспектарам міліцыі ў той жа дзень адшукалі і затрымалі злачынцу.

**Дзмітрый ДОЎНАР, намеснік начальніка Ленінскага аддзела (г. Мінска) Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь, маёр міліцыі.**

## Інфарм-укол

### Асноўныя правілы для ідэальнай постаці

**Парушэнне постаці і скрыўленне пазваночніка ў дзяўчынак сустракаецца часцей, чым у хлопчыкаў. Тлумачыцца гэта ў тым ліку і тым, што ў асобаў жаночага полу больш слабы мышачна-звязвальны апарат пазваночніка, недастаткова развіты мышцы спіны, жывата і часцей сустракаецца блізарукасць. Так што бацькам дзяўчынак трэба быць асабліва ўважлівымі пры азнаямленні з наступнай інфармацыяй.**

Пад уплывам умоў знешняга асяроддзя — бытавых умоў, сядзення за партай падчас вучобы, заняткаў спортам постаць можа мяняцца як у лепшы, так і ў горшы бок, таму розныя парушэнні постаці могуць быць поўнасцю выпраўлены. Добрая постаць забяспечвае правільнае становішча і нармальную дзейнасць унутраных органаў, асабліва лёгкіх і сэрца.

Вялікая ўвага ў прафілактыцы парушэння постаці надаецца сродкам загартоўвання — абціранням і абліванням халоднай вадой, знаходжанню летам на паветры з аголеным корпусам, умеранаму абпраменьванню сонцам, купанню ў рацэ, прагулкам. Дарослыя павінны сачыць за пасадкай дзяцей падчас пісьма і чытання, каб апошнія хадзілі з роўнай галавой, не насілі партфелі ў адной руцэ ці на адным плячы.

Звычка трымаць сваё тулава роўна не толькі ў час хады, але і за партай і сталом прыжываецца пры ўмове стварэння натуральнага мышачнага карсета. У гэтым сэнсе найбольш эфектыўным сродкам для агульнага ўмацавання арганізма і папярэджвання дэфектаў постаці з'яўляюцца фізічныя практыкаванні.

Вельмі карысныя ў сэнсе карэкцыі і сістэматычныя заняткі плаваннем, лыжамі, бальнымі танцамі. Цудоўным прафілактычным сродкам для школьнікаў застаецца штодзённая ранішняя гімнастыка.

Харчаванне павінна быць збалансаваным па ўтрыманні кальцыю, фосфару, магнію, бялку, паколькі правільная вітамінная дыета спрыяе стварэнню трывалага шкілета і мышачнага апарата. Дакладна ўстаноўлена, што прыём кальцыю з ежай або штодзённае ўжыванне дастатковай колькасці малочных прадуктаў спрыяе фарміраванню і захаванню коснай мінеральнай шчыльнасці.

**Утрыманне кальцыю ў (мг) на 100 г некаторых прадуктаў:**

малако — 120, ёгурт звычайны — 200, ёгурт фруктовы — 130, цвёрды сыр — 750, тварог — 80, белы шакалад — 280, халва — 670, пятрушка — 245, бабы — 250, арэхі — 30—250, хлеб белы — 170, хлеб чорны — 100, апельсін — 70, сардзіны ў масле (з касцямі) — 500, рыс — 230.

**Рэкамендаванае ўжыванне кальцыю і вітаміну $Д_3$ у суткі:**

дзеці да 6 месяцаў 400 — 400,
дзеці ад 6 месяцаў да 6 гадоў 600 — 400,
дзеці ад 6 гадоў да 11 гадоў 800—1200 — 200—400,
ад 12 да 24 гадоў 1200—1500 — 200—400.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.32 | 19.40 | 13.08 |
| Віцебск — | 6.20 | 19.31 | 13.11 |
| Магілёў — | 6.22 | 19.30 | 13.08 |
| Гомель — | 6.21 | 19.25 | 13.04 |
| Гродна — | 6.48 | 19.55 | 13.07 |
| Брэст — | 6.50 | 19.54 | 13.04 |

**Месяц**
*Першая квадра.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

**Імяніны**
**Пр.** *Анфісы, Івана, Дзмітрыя, Міхаіла, Пімена, Савы, Сцяпана.*
**К.** *Пятра, Сяргея, Якуба.*




**...у суседзяў**

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +22..+24°C | КІЕЎ +21..+23°C | РЫГА +14..+16°C |
| ВІЛЬНЮС +15..+17°C | МАСКВА +9..+11°C | С.-ПЕЦЯРБУРГ +10..+12°C |

## Дзве даты — 9 верасня

**Сёння — Сусветны дзень прыгажосці, які праводзіцца па ініцыятыве Міжнароднага камітэта эстэтыкі і касметалогіі.**

**1390 год** — горад Брэст першым з беларускіх гарадоў атрымаў магдэбургскае права. Першае ўзгадванне пра Брэст адносіцца да 1019 года ў «Аповесці мінулых часоў». Горад узнік як гандлёвы цэнтр і крэпасць. Адзін з нямногіх беларускіх гарадоў, які быў захоплены і знішчаны мангола-татарскімі войскамі.



**1828 год** — нарадзіўся Леў Мікалаевіч Талстой, славуты рускі пісьменнік. Аўтар раманаэпапеі «Вайна і мір», «Уваскрэсенне», «Ганна Карэніна», шматлікіх аповесцяў, драм.

**Цытата дня:**

***«З усіх відаў асцярожнасці асцярожнасць у каханні найбольш згубная для сапраўднага шчасця».***

**Бертран Расел (1872—1970), англійскі філосаф, матэматык.**

## Усміхнёмся!

**Сіноптыкі прайгралі скрыню гарэлкі хвораму на рэўматызм.**

☺

Сварацца муж з жонкай. Жонка:

— У маім жыцці было ўсяго два сапраўдныя мужчыны!

Муж, з цікаўнасцю:

— А другі хто?!!

—... Ды ты і з першым не знаёмы...

☺

**Глабальная несправядлівасць заключаецца ў тым, што колькасць чырвоных дзён у календары яшчэ не зраўнялася з колькасцю чорных, і з гэтым трэба нешта рабіць!**




# ПАСТУХ

Свет і сусвет чалавека

**Пастух — чалавек, які адказвае за захаванне статку (кароў, авечак і г.д.) у час летняга выпасу. Часам пастуху прыпісвалі здольнасць размаўляць з жывёламі, раслінным светам і светам духаў і нячыстай сілы. Яго параўноўвалі з ведзьмаком, бо ён мог кіраваць вялікім статкам, каровы слухаліся яго і ішлі за ім, як зачараваныя.**

- Пастуха аднавяскоўцы выбіралі вельмі адказна. Ён павінен быў валодаць здольнасцю лячыць жывёл, выконваць пэўныя магічныя дзеянні, накіраваныя на ахову жывёл.
- Так, пры першым выгане жывёлы ў поле пастухі павінны былі гучна сцёбаць бізунамі, свістаць, званіць у званочкі, граць на дудцы і г.д. Лічылася, што такімі дзеяннямі яны разганяюць злых духаў.
- У культуры ўсходніх славян было прынята, каб пры першым выгане кароў у поле пастух абыходзіў увесь статак хлебам-соллю з велікодным яйкам, пры гэтым жывёлу неабходна было сцёбаць асвечанай на Вербніцу вярбой.
- Абавязковым атрыбутам усіх пастухоў былі абярэгі, якія яны бралі з сабой на поле. Самымі распаўсюджанымі былі асвечаная ў Чысты чацвер соль, святая вада, яйкі, хлеб, розныя травы, сабраныя на Купалле, каменьчыкі, карэнне і г.д. Лічылася, што ў такім выпадку статак не будзе разыходзіцца, а жывёла будзе пладаноснай.
- Пастух павінен быў умець граць на дудцы, трубе і г.д. Лічылася, што «спецыяльным найгрышам» падпарадкоўвалася ўсё навокал: і жывёла, і расліны, і нячыстая сіла.
- У першы дзень выпасу жывёлы пастух павінен быў тройчы абысці ўвесь статак па сонцы, прытрымлівацца на працягу дня строгага посту.
- Не аднойчы за лета пастух выконваў магічныя дзеянні засцерагальнага або ахоўнага характару. Напрыклад, ён браў асвечаныя галінкі вярбы, ламаў іх на столькі частак, колькі кароў было ў яго статку, і раскідваў гэтыя часткі на полі. Такія дзеянні павінны былі захаваць жывёлу ад драпежных звяроў і ад таго, каб каровы не разбрыдаліся па полі.
- У народнай культуры існавала такое правіла: ні адзін пастух не возьме ў статак жывёлу пасля Юр'я. Гэта неабходна было зрабіць менавіта да Юр'я, інакш увесь статак будзе пакутаваць ад нападкаў ваўкоў і іншых драпежных звяроў.
- Лічылася, што навыкі і веды пастуха перадаюцца з пакалення ў пакаленне ад унука да ўнука, у сем'ях майстэрствам пастухоў ганарыліся.
- У некаторых палескіх вёсках пастуху забаранялася на працягу лета стрыгчыся і мець зносіны з жонкай, браць на поле, а таксама збіраць ягады і грыбы. Лічылася, што гэтымі дзеяннямі пастух абавязаны лесуну, «мясцоваму гаспадару», які пакарае яго і статак за невыкананне гэтых забаронаў.
- Апроч штодзённай платы, пастухоў віншавалі пры першым і апошнім выгане жывёлы ў поле. У Брэсцкай вобласці гэтыя абрады звалі «Запасне» і «Допасне» ці «Дзякаўшчына».
- Святам пастухоў лічылі дзень святога Юр'я. Іх частавалі ў полі яечняй, адорвалі палотнамі, адзеннем, грашыма. Часам пастухоў у святочныя дні аблівалі халоднай вадой. Гэта рабілася для таго, каб ён «не спаў» летам і не згубіў статак.
- Акрамя таго, пастухоў віншавалі на Вялікдзень, Тройцу, Міколу, у Пятроў дзень і на Іллю. Іх чакалі ў кожнай хаце, частавалі іх яечняй, хлебам, караваямі, маслам, сырам і г.д.
- На працягу года пастухі павінны былі выконваць шэраг рытуальных дзеянняў, каб атрымаць падтрымку вышэйшых сілаў для свайго майстэрства. Так, на Каляды пастухі рассыпалі па падлозе тры прыгаршчы гароху, і загадвалі на першую, каб вяліся прыгожыя гнядыя коні, на другую — здаровыя каровы і цяляты, на трэцюю — авечкі і ягняты.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

Прыгожага чалавека — маю даўнюю сяброўку і новую падпісчыцу «роднай газеты на роднай мове», **Таццяну Іванаўну САВЕНКА** шчыра віншую з прыгожай датай.
**Зычу — здароўя, дабра, фізічных і духоўных сілаў. На ўсё...**
**Соф'я Кусянкова,** *в. Лучын.*




У суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці паступіла заява аб **прызнанні адсутным без вестак грамадзяніна ЛІПАВА Дзмітрыя Віктаравіча**, 13 ліпеня 1980 года нараджэння, ураджэнца *в. Крупец Добрушскага раёна Гомельскай вобласці*, апошняе вядомае месца жыхарства — *г. Гомель, вул. Агаронка, 14, кв. 95*.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Д.В. Ліпава, паведаміць іх **суду Рэчыцкага раёна (г. Рэчыца, вул. К. Маркса, 30)** на працягу **двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.**

КІРМАШ
штотыднёвы рэкламны выпуск № 26 (594)
аддзел рэкламы ☎ 287 17 79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ПРАДАЕЦЦА

❐ Палова 2-кватэрнага дома з майстэрняй (пачата будаўніцтва) у Брэсцкім раёне, маюцца будматэрыялы, газ, вадаём, побач лес, сямейнаму кампаньёну без шкодных звычак для сумеснай справы.
Тэл. 8 029 801 69 81.

❐ Кватэра 2-пакаёвая ў Мінску.
Тэл.: 8 017 233 33 40, сот. 325 67 07.

❐ Катэдж 2-павярховы (газ, вада) каля ракі Нёман, 40 км ад г. Ліды, маецца сад, агарод, 18 тыс. у.а.
Маб. тэл. 889 95 10.

❐ Дом драўляны (еўрастандарт), добраўпарадкаваны, у райцэнтры Лельчыцы.
Тэл.: 8 02356 50 157, 8 029 669 76 18.

❐ Кабан вагой 150 кг у Дзяржынскім раёне.
Тэл. 8 029 854 29 09.

❐ ВАЗ-21063, 1986 г.в., у добрым стане.
Тэл. 8 044 712 83 66.

❐ Козы зааненскай пароды, узрост 1,5 года, надой 5—7 л.
Тэл. 8 044 714 17 20, 8 02234 35 646.

❐ «Рэно-сценік» 2000 г.в., 1,9 TДі, мінівэн, цёмна-сіні металік, ц/з, кандыцыянер, ABC, эл. пакет.
Тэл. 8 029 507 88 19.

❐ Трактар МТЗ-82 УК.
Тэл. 8 029 952 57 42.

❐ VW-пасат, 1990 г.в., 1,6 бензін, газ, 3500 у.а.
Тэл. 8 02236 21 098.

❐ Шумаметр (ШУМ-1М30), трансфарматары (ТА1-220-50).
Тэл.: 8 029 972 40 10, 8 017 223 53 78.

❐ Засцерагальнік А, пакетны выключальнік ПВ1-10, ПВ2-10.
Тэл.: 8 017 223 53 78, 8 029 935 75 15.

❐ Аўташыны «Матадор», б/к, 4 шт. (г. Мінск).
Тэл. 8 029 873 47 07.

❐ «Міцубісі-карызна», 1997 г.в., 1,8б, люк, фаркоп, кандыцыянер, магнітола.
Тэл. 8 033 635 09 53.

❐ Прычэп грузавы МАЗ-8162, «Зубраня» да легкавога аўто, форма для вырабу ж/б кольцаў.
Тэл. 8 029 917 55 81.

### КУПЛЮ

❐ Дом з лазняй у вёсцы не далей за 100 км ад Мінска, пажадана брэсцкі, гродзенскі ці слуцкі напрамкі.
Тэл.: 8 029 773 52 60, 8 017 205 57 17.

❐ Магазін, офіс.
Тэл. 8 029 798 14 42.

❐ Ангар, арачнік.
Тэл. 8 029 337 33 38.

### РОЗНАЕ

❐ Мяняю кватэру 4-пакаёвую прыватызаваную ў г. Слуцку на 2-пакаёвую ў г. Мінску.
Тэл.: 8 01795 25 156, маб. 947 34 34.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.
Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.407 Індэкс 63850. Зак. № 4917. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12